Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся

Серада 16 сакавіка 1938 г., № 15 (357)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

АДВАЖНАЙ ЧАЦВЁРЦЫ ПАПАНІНЦАЎ

Пісьменнікі Савецкай Беларусі ўсхвалявана вітаюць гераічную чацвёрку папанінцаў на вялікай зямлі, у вялікай сям'і народаў СССР. Ваш подвіг, які вы зрабілі ў гонар Савецкага Саюза, у гонар савецкай навукі, абагаціў чалавецтва новымі ведамі, вырванымі вамі з пучын ледавітага мора і палярнай пурговай начы.

Толькі партыя Леніна—Сталіна, толькі Савецкі Саюз далі ў рукі чалавека магутнейшую зброю для пакарэння ўсіх стыхій прыроды, у тым ліку і паўночнага лёду. Савецкі чалавек прышоў у ледзяныя прасторы не як афяра, а як пераможац, не як адзіночка, а як прадстаўнік вялікага 170-мільённага народа, цесна звязанага з ім штодзённымі думкамі. Савецкі чалавек прышоў у ільды ўзброены велізарнейшай тэхнікай, якую любоўна рыхтавалі рабочыя калектывы нашай краіны. і савецкі чалавек перамог! Перамог чалавечы розум, накіраваны рукой партыі Леніна—Сталіна!

Ваш подвіг здзіўляе, хвалюе, бязмежна радуе і натхняе савецкіх пісьменнікаў.

Прывет вам, героі-папанінцы, прывет, родныя, блізкія, любімыя!

САЮЗ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

ПРЫСУД НАРОДА

Працэс закончан. Перад тварам усяго свету прадстала аголеная звярыная морда міжнароднага фашызма, галаўным атрадам якога з'яўляліся подлыя здраднікі, каты і падпольныя забойцы з «права-трацкісцкага блока» — Бухарын, Рыкаў, Крэсцінскі, Чэрноў, Розенгольц, Ягода, Шаранговіч і іншыя фашысцкія найміты, кіруемыя обер-бандытам іудам Троцкім і разведкамі замежных дзяржаў.

Дышачы звярынай злабой да народа, — гнусныя здраднікі—закляты вораг народа Троцкі і «тэарэтык» бандытызма і шпіянажу Бухарын з першых-жа дзён існавання савецкай дзяржавы рыхтавалі паражэнне соцыялістычнай рэволюцыі. Гэта яны разам з падобнай да сябе нечысцю — «левымі» і правымі эсэрамі — спрабавалі сарваць Брэсцкі мір, тым самым адчыніць вароты германскім арміям і затапіць у крыві рабочых і сялян маладую савецкую рэспубліку. Гэта яны—жалкае атрэп'е роду чалавечага — ўзнімалі свае брудныя лапы на Леніна, Сталіна і Свердлова. Гэта яны, тройчы праклятыя ў вяках і пакаленнях, накіроўвалі ўдар эсэркі Каплан у сэрца вялікага Леніна, выходзячы з той-жа звярынай нянавісці да народа, жадаючы паражэння соцыялістычнай рэволюцыі.

Самкнуўшыся ў права-трацкісцкую банду, растленыя з растленых фашысцкія найміты бухарыны, рыкавы, крэсцінскія, ягоды, чэрновы прадавалі нашу радзіму, гандлявалі ваеннымі тайнамі, арганізоўвалі шпіянаж, учынялі дыверсійныя акты.

Подлыя здраднікі радзімы, яны намерваліся адкрыць фронты азвярэлым фашысцкім полчышчам у выпадку нападу фашыстаў на СССР, рыхтуючы паражэнне СССР у вайне.

Перавышаючы сваім пачварным ізуверствам усе вядомыя ў гісторыі прыклады, па прамых дырэктывах ворага народа Троцкага, пад кіраўніцтвам Бухарына і Рыкава, праз ката Ягоду і яго прыслужнікаў—урачоў-забойцаў, гэтыя гнусныя фашысцкія каты забілі незабыўнага С. М. Кірава, непахіснага чэкіста Менжынскага, вернага сына партыі Куйбышэва, благароднага і гордага буравесніка рэволюцыі, геніяльнага пісьменніка рускага народа А. М. Горкага і яго сына М. Пешкова. Трапешчучы перад савецкай разведкай, яны замахваліся на жыццё сталінскага наркома Н. І. Ежова. І ўсе гэтыя кашмарныя злачынствы рабіліся для таго, каб нізвергнуць у СССР лад соцыялізма, каб рэстаўрыраваць капіталізм, каб устанавіць над вольным і шчаслівым савецкім народам праізвол памешчыкаў і капіталістаў.

Час расплаты настаў! Савецкі суд вынес удзельнікам антысавецкага «права-трацкісцкага блока» свой справядлівы прыгавор. Ваенная калегія Вярхоўнага Суда прыгаварыла восемнаццаць трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма да расстрэлу.

Прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда СССР з'яўляецца прыгаворам савецкага народа, вяшчаючым свету аб знішчэнні галаўнога атрада міжнароднага фашызма.

Працэс закончан. Заклеймёныя ганьбай і пагардай усіх чэсных людзей свету, усяго савецкага народа, імёны фашысцкіх наймітаў Троцкага, Бухарына, Рыкава, Крэсцінскага, Ягоды і іх прыспешнікаў увойдуць у вякі сінонімамі крывавых злачынстваў фашызма.

«А над намі, — гаворачы словамі дзяржаўнага абвінаваўцы — Пракурора СССР тав. Вышынскага, — над нашай шчаслівай краінай па-ранейшаму ясна і радасна будзе зіхацець сваімі светлымі праменнямі наша сонца. Мы, наш народ, будзем па-ранейшаму крочыць па ачышчанай ад апошняй нечысці і мерзасці мінулага дарозе, на чале з нашым любімым правадыром і настаўнікам — вялікім Сталіным — наперад і наперад, да комунізма!»

Працэс антысавецкага „права-трацкісцкага блока“

ПРЫГАВОР

ІМЕМ САЮЗА САВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК ВАЕННАЯ КАЛЕГІЯ ВЯРХОЎНАГА СУДА САЮЗА ССР У СКЛАДЗЕ:

Старшынствуючага—старшыні Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР Армваенюрыста В. В. УЛЬРЫХ
Членаў: намесніка старшыні Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР Корваенюрыста І. О. МАТУЛЕВІЧА і члена Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР Дыўваенюрыста Б. І. ІЕЎЛЕВА
Пры сакратару—ваенным юрысце І ранга А. А. БАТНЕР

з удзелам Дзяржаўнага абвінаваўцы —пракурора Саюза ССР тав. А. Я. **ВЫШЫНСКАГА** і членаў маскоўскай калегіі абаронцаў т. т. **І. Д. БРАУДЭ** і Н. В. **КОМАДАВА**—у адкрытым судовым пасяджэнні, у горадзе Маскве 2—13 сакавіка 1938 года, разглядзела справу па абвінавачанню:

1. **Бухарына** Нікалая Іванавіча, 1888 года нараджэння;
2. **Рыкава** Алексея Іванавіча, 1881 года нараджэння;
3. **Ягоды** Генрыха Грыгор'евіча, 1891 года нараджэння;
4. **Крэсцінскага** Нікалая Нікалаевіча, 1883 года нараджэння;
5. **Ракоўскага** Хрысціяна Георгіевіча, 1873 года нараджэння;
6. **Розенгольца** Аркадзія Паўлавіча, 1889 года нараджэння;
7. **Іванова** Владзіміра Іванавіча, 1893 года нараджэння;
8. **Чэрнова** Міхаіла Александравіча, 1891 года нараджэння;
9. **Грынько** Грыгорыя Фёдаравіча, 1890 года нараджэння;
10. **Зеленскага** Ісака Абрамавіча, 1890 года нараджэння;
11. **Бессонава** Сергея Алексеевіча, 1892 года нараджэння;
12. **Ікрамава** Акмаля, 1898 года нараджэння;
13. **Хаджаева** Файзулы, 1896 года нараджэння;
14. **Шаранговіча** Васілія Фаміча, 1897 года нараджэння;
15. **Зубарэва** Пракопія Тімафеевіча, 1886 года нараджэння;
16. **Буланава** Паўла Петровіча, 1895 года нараджэння;
17. **Левіна** Льва Грыгор'евіча, 1870 года нараджэння;
18. **Плетнёва** Дзмітрыя Дзмітрыевіча, 1872 года нараджэння;
19. **Казакова** Ігнація Нікалаевіча, 1891 года нараджэння;
20. **Максімава-Дзікоўскага** Веніаміна Адамавіча (Абрамавіча), 1900 года нараджэння і
21. **Кручкова** Петра Петровіча, 1889 года нараджэння —

— усіх у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-ІА, 58-2, 58-7, 58-8, 58-9 і 58-11 К.К. РСФСР, а **Іванова, Зеленскага** і **Зубарэва,** апрача таго, у злачынствах, прадугледжаных арт. 58-13 К.К. РСФСР.

Папярэднім і судовым следствам устаноўлена:

Падсудныя **Бухарын, Рыкаў, Ягода, Крэсцінскі, Розенгольц, Грынько, Шаранговіч, Хаджаеў, Ікрамаў, Іваноў, Зубарэў, Зеленскі** і **Чэрноў,** з'яўляючыся непрымірымымі ворагамі савецкай улады, у 1932—33 годах па заданню разведак варожых да СССР замежных дзяржаў арганізавалі змоўніцкую групу пад назвай «права-трацкісцкі блок», які аб'яднаў падпольныя антысавецкія групы трацкістаў, правых, зіноўеўцаў, меншавікоў, эсэраў, буржуазных нацыяналістаў Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік.

«Права-трацкісцкі блок» паставіў сваё мэтаю звяржэнне існуючага ў СССР соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, аднаўленне ў СССР капіталізма і ўлады буржуазіі шляхам дыверсійна-шкодніцкай, тэрарыстычнай, шпіёнска-здрадніцкай дзейнасці, накіраванай на падрыў эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза і садзейнасць замежным агрэсарам у паражэнні і расчляненні СССР.

Пазбаўленыя ўсякай апоры ўнутры СССР, кіраўнікі «права-трацкісцкага блока» з мэтаю ажыццяўлення сваіх злачынных замыслаў заключылі праз ворага народа **Л. Троцкага** і асобных удзельнікаў антысавецкага «права-трацкісцкага блока» пагадненне з прадстаўнікамі некаторых замежных дзяржаў аб узброенай дапамозе ў звяржэнні савецкай улады ў СССР на ўмовах яго расчлянення і адтаржэння ад СССР Украіны, Беларусі, Прымор'я, Сярэдне-Азіяцкіх і Закаўказскіх рэспублік — на карысць памянёных замежных дзяржаў.

Гэты здрадніцкі згавор «права-трацкісцкага блока» з прадстаўнікамі замежных дзяржаў аблягчаўся тым, што кіруючыя ўдзельнікі антысавецкай змовы з'яўляліся прамымі агентамі замежных разведак і ажыццяўлялі на працягу многіх гадоў шпіёнскую дзейнасць на карысць гэтых разведак.

Крэсцінскі па прамому заданню ворага народа — агента германскай і англійскай разведак **Л. Троцкага** ўступіў у здрадніцкую сувязь з германскім рэйхсверам у 1921 годзе і быў германскім шпіёнам да дня свайго арышту ў 1937 годзе, атрымліваючы за сваю шпіёнскую работу і на злачынную дзейнасць трацкісцкай арганізацыі па 250.000 германскіх марак золатам штогод.

Розенгольц пачаў шпіёнскую работу для германскага генеральнага штаба ў 1923 годзе, для англійскай разведкі ў 1926 годзе.

Ракоўскі з'яўляўся агентам англійскай разведкі з 1924 года і японскім шпіёнам з 1934 года.

Чэрноў пачаў шпіёнскую работу на карысць Германіі ў 1928 годзе, звязаўшыся з германскай разведкай пры садзейнасці вядомага меншавіка-эмігранта **Дана.**

Шаранговіч быў завербаваны і пакінуты польскай разведкай для шпіёнскай работы ў СССР у 1921 годзе і быў польскім шпіёнам да дня свайго арышту.

Грынько з'яўляўся германскім і польскім шпіёнам з 1932 года.

Па заданню ворага народа **Л. Троцкага** і кіруючых удзельнікаў «права-трацкісцкага блока» — **Бухарына, Рыкава і Ягоды** — члены «права-трацкісцкага блока» **Розенгольц, Крэсцінскі, Ракоўскі, Грынько і Бессонаў** у яўна здрадніцкіх мэтах уступілі ў непасрэдныя зносіны з прадстаўнікамі варожых СССР замежных дзяржаў і вялі з імі перагаворы аб формах дапамогі замежным агрэсарам у выпадку іх нападу на Савецкі Саюз (арганізацыя тэрарыстычных і дыверсійна-шкодніцкіх актаў, шпіянаж).

Кіраўнікі «права-трацкісцкага блока», у тым ліку **Рыкаў, Бухарын і Ягода,** былі не толькі поўнасцю асвядомлены аб шпіёнскай дзейнасці сваіх саўдзельнікаў, але ўсяляк заахвочвалі расшырэнне шпіёнскіх сувязей і самі давалі ўказанні ўдзельнікам «права-трацкісцкага блока» пры іх здрадніцкіх перагаворах з прадстаўнікамі замежных дзяржаў, фарсіруючы падрыхтоўку замежнай інтэрвенцыі.

Па прамых дырэктывах замежных разведак удзельнікі «права-трацкісцкага блока» арганізавалі дыверсійна-шкодніцкія групы, ахапіўшы імі рад прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі і сістэмы тавараабароту і вялі разбуральную дзейнасць, маючы сваёй задачай паралізаваць гаспадарчае жыццё краіны і паслабіць абараназдольнасць Савецкага Саюза.

Па ўказаннях японскай разведкі ўдзельнікі «права-трацкісцкага блока» арганізавалі ў Далёка-Усходнім краі крушэнне поезда з вайсковым грузам на станцыі Валачаеўка і поезда № 501 на перагоне Хор—Дармідонтаўка, а таксама зрабілі некалькі дыверсій на шахтах у Сучане. Усе гэтыя дыверсіі суправаджаліся чалавечымі афярамі.

Па дырэктыве ворага народа **Л. Троцкага** і на аснове згавору з прадстаўнікамі замежных дзяржаў **Розенгольц** праводзіў у сістэме Наркамзнешгандлю шкодніцкую работу, накіраваную на аказанне дапамогі Германіі і Японіі і суправаджаўшуюся нанясеннем эканамічных страт СССР. Апрача таго, Розенгольц шляхам розных валютных камбінацый сістэматычна фінансаваў Троцкага.

Чэрноў па заданню германскай разведкі і ўказаннях **Рыкава** выкарыстаў сваё адказнае службовае становішча ў зямельных органах СССР для арганізацыі праз сваіх саўдзельнікаў раду буйных дыверсійна-шкодніцкіх актаў па зніжэнню ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і псаванню сельскагаспадарчых мабілізацыйных запасаў, па скарачэнню пагалоўя конскага складу і буйнай рагатай жывёлы, у прыватнасці шляхам штучнага распаўсюджання эпізаатыі, прычым толькі ва Усходняй Сібіры ў 1936 годзе ў рэзультаце гэтага загінула каля 25.000 коней.

Грынько па заданню кіраўнікоў «права-трацкісцкага блока» і германскай разведкі, з мэтаю выклікаць незадаволенне насельніцтва і тым самым аблягчыць вярбоўку сваіх прыхільнікаў, праводзіў у сістэме Народнага Камісарыята Фінансаў шырокую шкодніцкую работу, якая выражалася ў затрыманні выплаты заработнай платы, дрэнным абслугоўванні насельніцтва ашчаднымі касамі, незаконным спагнанні некаторых падаткаў з сялян і іншых шкодніцкіх мерапрыемствах.

Шаранговіч, з'яўляючыся адным з кіраўнікоў беларускай нацыянал-фашысцкай арганізацыі, па заданню польскіх разведчых органаў і кіраўнікоў «права-трацкісцкага блока» — **Рыкава** і іншых, разгарнуў шырокую дыверсійна-шкодніцкую дзейнасць у галіне сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўлі і прамысловасці Беларусі, аблягчаючы тым самым ажыццяўленне задач агрэсараў у выпадку іх узброенага нападу на **БССР.**

Ікрамаў і **Хаджаеў** па ўказанню **Бухарына** разгарнулі вялікую дыверсійна-шкодніцкую работу ў розных галінах народнай гаспадаркі Узбекістана з мэтаю выклікаць незадаволенне насельніцтва і тым самым стварыць спрыяючыя ўмовы для падрыхтоўкі ў перыяд замежнай інтэрвенцыі ўзброеных выступленняў супроць савецкай улады.

Зеленскі арганізаваў у Цэнтрасаюзе і ў сістэме спажывецкай кааперацыі шкодніцкія групы і пры іх дапамозе, з мэтаю выклікаць незадаволенне насельніцтва, заблытваў планіраванне тавараў, затрымліваў прасоўванне іх у вёску, псаваў і гнаіў прадукты харчавання, падкідваў у іх шкло і цвікі, наўмысля зрываў забеспячэнне прадметамі першай неабходнасці нізавой гандлёвай сеткі кааперацыі.

Іваноў па заданню **Бухарына** праводзіў шкодніцка-дыверсійную дзейнасць у лясной гаспадарцы Паўночнага края.

Зубарэў, з'яўляючыся актыўным удзельнікам падпольнай арганізацыі правых, па заданню **Рыкава** займаўся шкодніцтвам у сельскай гаспадарцы ў радзе абласцей РСФСР.

Побач з актыўнай дыверсійна-шкодніцкай дзейнасцю, удзельнікі «права-трацкісцкага блока» па заданню германскай, японскай і польскай разведак, пад непасрэдным кіраўніцтвам **Рыкава** і **Бухарына** і пры актыўным удзеле **Іванова, Хаджаева, Ікрамава, Зубарэва, Шаранговіча, Грынько** і **Зеленскага** падрыхтоўвалі ў Сібіры, на Паўночным Каўказе, на Украіне, Беларусі, Узбекістане і ў іншых мясцовасцях Савецкага Саюза бандыцка-паўстанчыя кулацкія кадры для арганізацыі ўзброеных выступленняў у тылу Чырвонай Арміі да пачатку інтэрвенцыі супроць СССР.

У мэтах расшырэння бандыцка-паўстанчай кулацкай базы, па рашэнню кіраўнікоў «права-трацкісцкага блока», **Бухарын** устанавіў арганізацыйныя сувязі з падпольным ЦК эсэраўскай арганізацыі, якая дзейнічала ў СССР, а таксама з закардонным ЦК эсэраў.

Па прамому згавору з замежнымі разведкамі і па заданню ворага народа **Л. Троцкага** «права-трацкісцкі блок» арганізаваў рад тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і Савецкага Урада.

У 1934 годзе адзін з кіруючых удзельнікаў «права-трацкісцкага блока» **Рыкаў** асабіста стварыў тэрарыстычную групу для падрыхтоўкі і правядзення тэрарыстычных актаў у адносінах таварышаў Сталіна, Молатава, Кагановіча і Варашылава.

У жніўні 1937 года **Розенгольц** асабіста прабаваў зрабіць тэрарыстычны акт у адносінах таварыша Сталіна, для чаго не раз дабіваўся ў яго прыёму.

Зладзейскае забойства С. М. Кірава, ажыццёўленае 1-га снежня 1934 года Ленінградскім трацкісцка-зіноўеўскім тэрарыстычным цэнтрам, як гэта ўстаноўлена папярэднім і судовым следствам па данай справе, было арганізавана па рашэнню «права-трацкісцкага блока», пры чым непасрэдны ўдзел у арганізацыі гэтага тэрарыстычнага акту прымаў падсудны **Ягода,** які даў спецыяльныя ўказанні сваім саўдзельнікам, працаваўшым у Ленінградскім упраўленні НКВД, не перашкаджаць правядзенню гэтага злачынства.

Па ўказанню ворага народа **Л. Троцкага** кіраўнікі «права-трацкісцкага блока» ў 1934 годзе прынялі рашэнне забіць вялікага пролетарскага пісьменніка Максіма Горкага. Гэты страшэнны тэрарыстычны акт было даручана арганізаваць **Ягодзе,** які, азнаёміўшы з мэтамі змовы хатняга ўрача М. Горкага — доктара **Левіна,** а затым урача **Плетнёва,** даручыў ім шляхам шкодніцкіх метадаў лячэння дабіцца смерці М. Горкага, што і было выканана пры кіруючым удзеле ў гэтай злачыннай справе доктара **Левіна.** Актыўны ўдзел у гэтым злодзеянні прымалі ўдзельнікі «права-трацкісцкага блока» б. сакратар М. Горкага — **Кручкоў** і б. сакратар НКВД — **Буланаў.**

Па рашэнню кіраўнікоў «права-трацкісцкага блока» **Ягода** арганізаваў метадамі шкодніцкага лячэння забойства старшыні АДПУ тав. В. Р. Менжынскага і намесніка старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. В. В. Куйбышэва, пры чым у правядзенні тэрарыстычнага акту ў адносінах тав. Куйбышэва непасрэдны ўдзел прымалі **Левін** і б. сакратар Куйбышэва, удзельнік падпольнай арганізацыі правых з 1928 года, **Максімаў-Дзікоўскі,** а ў правядзенні тэрарыстычнага акту ў адносінах В. Р. Менжынскага непасрэдны ўдзел прымалі **Буланаў** і завербаваны **Ягодай** і **Левіным** у змоўніцкую групу — урач **Казакоў.**

Апрача таго ўстаноўлена, што **Левін** і **Кручкоў,** па прамому заданню **Ягоды,** шкодніцкімі метадамі лячэння ўмярцвілі сына А. М. Горкага—М. А. Пешкова.

У сувязі з назначэннем у верасні 1936 года таварыша Н. І. Ежова Народным камісарам унутраных спраў СССР «права-трацкісцкі блок», апасаючыся поўнага выкрыцця і разгрому антысавецкіх кадраў, даручыў **Ягодзе** зрабіць тэрарыстычны акт у адносінах т. Н. І. Ежова.

Выконваючы гэта зладзейскае даручэнне, **Ягода** пры непасрэдным удзеле **Буланава** рабіў замах восенню 1936 года на жыццё т. Н. І. Ежова шляхам паступовага атручэння яго арганізма спецыяльна прыгатаваным для гэтага ядам, з прычыны чаго была нанесена значная шкода здароўю Н. І. Ежова.

Апрача таго ўстаноўлена, што **Бухарын** па рашэнню цэнтра антысавецкай арганізацыі правых яшчэ ў 1930 годзе дагаварыўся з эсэрам-баявіком—арганізатарам забойства тав. Валадарскага і замаху на жыццё В. І. Леніна ў 1918 годзе — Семёнавым аб стварэнні ім раду тэрарыстычных груп для падрыхтоўкі і правядзення тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і Савецкага Урада.

Таксама ўстаноўлена, што ў 1918 годзе **Бухарын** і ўзначальваемая ім група «левых» комуністаў, разам з Троцкім і «левымі» эсэрамі, арганізавалі змову супроць Савецкага Урада.

Бухарын і яго саўдзельнікі па змове мелі мэтаю сарваць Брэсцкі дагавор, звергнуць Савецкі Урад, арыштаваць і забіць В. І. Леніна, І. В. Сталіна і Я. М. Свердлова і сфармаваць новы ўрад з бухарынцаў, трацкістаў і «левых» эсэраў.

Выконваючы план змовы, «левыя» эсэры ў ліпені 1918 года, з ведама і згоды Бухарына, паднялі ў Маскве мяцеж з мэтаю звяржэння Савецкага Урада; пры гэтым устаноўлена, што зроблены эсэркай Каплан 30-га жніўня 1918 года замах на жыццё В. І. Леніна з'явіўся прамым вынікам злачынных замыслаў «левых» комуністаў на чале з **Бухарыным** і іх саўдзельнікаў «левых» і правых эсэраў.

Папярэднім і судовым следствам устаноўлена, што падсудныя па данай справе — **Зеленскі, Іваноў** і **Зубарэў** уступілі на шлях барацьбы з рэволюцыйным рухам рабочага класа яшчэ ў годы царызма.

Зеленскі быў агентам-правакатарам самарскага жандарскага ўпраўлення з 1911 года па 1913 год.

Іваноў быў агентам-правакатарам ахраннага аддзялення і жандарскага ўпраўлення ў Маскве і іншых гарадах з 1911 па 1916 год.

Зубарэў, будучы завярбован у лік агентаў-правакатараў у гор. Кацельнічы ў 1908 годзе, займаўся правакатарскай дзейнасцю да 1917 года.

Такім чынам **Ваенная Калегія Вярхоўнага Суда Саюза ССР** устанавіла віноўнасць 1. **Бухарына** Н. І., 2. **Рыкава** А. І., 3. **Ягоды** Г. Г., 4. **Крэсцінскага** Н. Н., 5. **Ракоўскага** Х. Г., 6. **Розенгольца** А. П., 7. **Іванова** В. І., 8. **Чэрнова** М. А., 9. **Грынько** Г. Ф., 10. **Зеленскага** І. А., 11. **Бессонава** С. А., 12. **Ікрамава** А., 13. **Хаджаева** Ф., 14. **Шаранговіча** В. Ф., 15. **Зубарэва** П. Т., 16. **Буланава** П. П., 17. **Левіна** Л. Г., 18. **Плетнёва** Д. Д., 19. **Казакова** І. Н., 20. **Максімава-Дзікоўскага** В. А. і 21. **Кручкова** П. П. — у тым, што яны, з'яўляючыся актыўнымі ўдзельнікамі змоўніцкай групы пад назвай «права-трацкісцкі блок», якая дзейнічала па прамых заданнях разведак замежных дзяржаў, праводзілі здрадніцка-шпіёнскую, дыверсійна-шкодніцкую, тэрарыстычную дзейнасць, правацыруючы ваенны напад на СССР гэтых дзяржаў з мэтаю паражэння і расчлянення Савецкага Саюза і адтаржэння ад яго Украіны, Беларусі, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Прымор'я на Далёкім Усходзе — на карысць варожых да СССР замежных дзяржаў, маючы сваёй канчатковай мэтай звяржэнне існуючага ў СССР соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу і аднаўленне ў СССР капіталізма і ўлады буржуазіі, г. зн. ва ўчыненні найцяжэйшых дзяржаўных злачынстваў, прадугледжаных арт. арт. 58-Іа, 58-2, 58-7, 58-8, 58-9 і 58-11 КК РСФСР, а **Іванова, Зеленскага** і **Зубарэва,** апрача таго, ва ўчыненні злачынстваў, прадугледжаных арт. 58-13 КК РСФСР.

На падставе пададзенага і кіруючыся арт. арт. 319 і 320 КПК РСФСР, **Ваенная Калегія Вярхоўнага Суда Саюза ССР**

ПРЫГАВАРЫЛА:

1. **Бухарына** Нікалая Іванавіча,
2. **Рыкава** Алексея Іванавіча,
3. **Ягоду** Генрыха Грыгор'евіча,
4. **Крэсцінскага** Нікалая Нікалаевіча,
5. **Розенгольца** Аркадзія Паўлавіча,
6. **Іванова** Владзіміра Іванавіча,
7. **Чэрнова** Міхаіла Александравіча,
8. **Грынько** Грыгорыя Фёдаравіча,
9. **Зеленскага** Ісака Абрамавіча,
10. **Ікрамава** Акмаля,
11. **Хаджаева** Файзулу,
12. **Шаранговіча** Васілія Фаміча,
13. **Зубарэва** Пракопія Тімафеевіча,
14. **Буланава** Паўла Петровіча,
15. **Левіна** Льва Грыгор'евіча,
16. **Казакова** Ігнація Нікалаевіча,
17. **Максімава-Дзікоўскага** Веніяміна Адамавіча (Абрамавіча) і
18. **Кручкова** Петра Петровіча

— да вышэйшай меры крымінальнага пакарання — расстрэлу, з канфіскацыяй усёй асабіста ім належачай маемасці.

19. **Плетнёва** Дзмітрыя Дзмітрыевіча, як не прымаўшага непасрэднага актыўнага ўдзелу ва ўмярцвенні тт. В. В. Куйбышэва і А. М. Горкага, хоць і садзейнічаўшага гэтаму злачынству — да **турэмнага зняволення на дваццаць пяць гадоў** з паражэннем у палітычных правах на пяць гадоў пасля адбыцця турэмнага зняволення і з канфіскацыяй усёй асабіста яму належачай маемасці.

20. **Ракоўскага** Хрысціяна Георгіевіча і
21. **Бессонава** Сергея Алексеевіча — як не прымаўшых прамога ўдзелу ў арганізацыі тэрарыстычных і дыверсійна-шкодніцкіх дзеянняў — **да турэмнага зняволення тэрмінам: Ракоўскага на дваццаць гадоў і Бессонава на пятнаццаць гадоў** з паражэннем кожнага ў палітычных правах на пяць гадоў па адбыцці турэмнага зняволення і з канфіскацыяй усёй асабіста ім належачай маемасці.

Тэрмін турэмнага зняволення Плетнёву, Ракоўскаму і Бессонаву вылічаць з дня іх арышту.

Старшынствуючы — старшыня Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР армваенюрыст В. УЛЬРЫХ.

Члены: Намеснік старшыні Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР корваенюрыст І. МАТУЛЕВІЧ.

Член Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР дыўваенюрыст Б. ІЕЎЛЕЎ.

ПРАКЛЁН

Калісьці, у вяках, кайданамі закуты,
Бядою змучаны, знядужаны народ
Жахлівым словам выклікаў свае пакуты,
На дзікім камені укленчыўшы на ўсход.
Ад страшных слоў, здавалася, счарнеюць пушчы,
Пасохнуць стромкія, зялёныя бары,
Сляпыя жабракі — займеюць зрок відушчых,
Пакорныя рабы — падымуць тапары.
Прайшлі гады... Народ маёй зямлі вялікай
Узняўся, радасны, тварыць, змагацца, жыць...
А каля ног, набраклыя слюной труізны,
Маўкліва поўзаюць гадзюкі і вужы.
Да сэрца тышчуцца... Але не дрэмле вока
Надзейных воінаў і пільных вартавых:
Прадажнікі з усім сваім трацкісцкім блокам
Стаяць перад судом забітых і жывых.
Раскрыты да канца і планы іх, і карты,
І справы чорныя на згубу нашых дзён...
І не знаходзіш слоў для гневу і пагарды,
Бляднее самы страшны прадзедаў праклён.
Ад жудасці жывыя камянеюць вусны,
Але й нямыя нашы галасы гудуць,
І вам, крывавым псам, прадажным і распусным,
Суровай і праўдзівай кары не мінуць.
Узняты воляю народнай і законам
Над баязлівымі гарбамі вашых плеч,
Магутным і няўмольным прагучыць праклёнам
Няшчадны й востры пролетарскі меч.

Пятро ГЛЕБКА.

НАРОДНЫ ПРЫГАВОР

Дзе слова адшукаць, каб стала
Належным імем зграі той,
Што кроў народа пралівала,
Радзімай светлай гандлявала,
Пад маскай твар схаваўшы свой?
Дзе-ж подласці і здрады межы?
Грыміць ад мора і да гор,
Як клятва ля Крэмлёўскіх вежаў
Народны гнеўны прыгавор.
Вякі, каб знялі гэту кару, —
На месцы кары кол загнаць,
А на калу, чарней за хмару,
Каб свет убачыў, — напісаць:
«Для ўсіх складальнікаў гісторыі,
Для новых будучых людзей —
Скарана подласць тут, каторай
Падобнай не было нідзе.
Крумкач крыляе палахліва,
Трава чарней тут за вугля.
Кляне тых вырадкаў жахлівых
Радзіўшая на свет зямля».

К. ЦІТОЎ.

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

Прамова дзяржаўнага абвінаваўцы—пракурора Саюза ССР таварыша А. Я. ВЫШЫНСКАГА*)

Асаблівасці цяперашняга працэса

Таварышы суддзі, члены Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР!

Не ў першы раз Вярхоўны Суд нашай краіны разглядвае справу аб найцяжэйшых злачынствах, накіраваных супроць добрабыту нашай радзімы, супроць нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны — бацькаўшчыны працоўных усяго свету. Але ці ледзь я памылюся, сказаўшы, што ўпершыню нашаму суду прыходзіцца разглядваць такую справу, як гэта, разглядваць справу аб такіх злачынствах і такіх зладзействах, як тыя, што прайшлі перад вашымі вачыма, што прайшлі перад вачыма ўсяго свету на гэтым судзе, аб такіх злачынцах, як гэтыя злачынцы, што сядзяць зараз перад вамі на лаве падсудных.

На самой справе, які судовы працэс з усіх тых, якіх, у сілу ўмоў класавай барацьбы і жорсткага супраціўлення справе соцыялізма з боку нашых ворагаў, прайшло ў нас за апошні час нямала, можа параўнацца з цяперашнім працэсам па страшэннасці, нагласці і цынізму злачынстваў, зробленых гэтымі панамі!

У якім іншым працэсе ўдалося ўскрыць і выявіць з такой сілай і глыбінёй сапраўдную прыроду гэтых злачынстваў, з такой сілай сарваць з твару нягоднікаў іх каварныя маскі і паказаць усяму нашаму народу і ўсім чэсным людзям усяго свету звярыны твар міжнародных разбойнікаў, майстэрска і ўмела накіроўваючых руку зладзеяў супроць нашай мірнай соцыялістычнай працы, пабудаваўшай новае, шчаслівае і радасна-квітнеючае соцыялістычнае грамадства рабочых і сялян!

Ужо гэта адна акалічнасць гаворыць дастаткова ясна аб велізарным грамадска-палітычным значэнні гэтага працэса, аб тым, што даны працэс уяўляе сабой выдаючуюся з'яву, што даны працэс мае **значэнне гістарычнае.**

У чым заключаецца гістарычнае значэнне данага працэса? У чым заключаюцца некаторыя яго асаблівасці?

Гістарычнае значэнне гэтага працэса заключаецца перш за ўсё ў тым, што на гэтым працэсе з выключнай дасканаласцю і дакладнасцю паказана, даказана, устаноўлена, што **правыя, трацкісты, меншавікі, эсэры, буржуазныя нацыяналісты** і так далей і таму падобнае з'яўляюцца ні чым іншым, як **беспрынцыповай, безыдэйнай бандай забойц, шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў.**

Роўна год назад таварыш Сталін, аналізуючы недахопы нашай работы і ўказваючы меры ліквідацыі трацкісцкіх і іншых двурушнікаў, гаварыў:

«Два словы аб шкодніках, дыверсантах, шпіёнах і т. д. Цяпер, я думаю, ясна для ўсіх, што цяперашнія шкоднікі і дыверсанты, якім-бы флагам яны ні маскіраваліся, трацкісцкім або бухарынскім, даўно перасталі ўжо быць палітычнай плынню ў рабочым руху, што яны ператварыліся ў беспрынцыповую і безыдэйную банду прафесіянальных шкоднікаў, дыверсантаў, шпіёнаў, забойц. Зразумела, што гэтых паноў прыдзецца граміць і карчаваць бязлітасна, як ворагаў рабочага класа, як здраднікаў нашай радзіме. Гэта ясна і не патрабуе далейшых растлумачэнняў».

Прайшоў год. На прыкладзе гэтага працэса мы бачым, як глыбока праў быў таварыш Сталін у сваёй ацэнцы трацкістаў і бухарынцаў.

Трацкісты і бухарынцы, г. зн. «права-трацкісцкі блок», верхавінка якога сядзіць зараз на лаве падсудных—гэта не палітычная партыя, не палітычная плынь, гэта банда крымінальных злачынцаў і не проста крымінальных злачынцаў, а злачынцаў, прадаўшыхся варожым разведкам, злачынцаў, якіх нават крымінальнікі трэтыруюць, як самых падшых, самых апошніх, прэзрэнных, самых растлёных з растлёных.

Так называемы «права-трацкісцкі блок» — гэта арганізацыя шпіянажу, дыверсій, шкодніцтва, палітычных забойстваў і распродажу сваёй радзімы ворагам.

У блока няма нічога ідэйнага, нічога, так сказаць, «духоўнага», нічога ідэалагічнага. Што калісьці ў якойсьці меры ў некаторых з удзельнікаў гэтага блока было, то даўным даўно разгублена, страчана, даўным даўно знікла, спарахнела ў смуродным, агідным шпіёнскім падполлі.

Праўда, некаторыя з падсудных, асабліва падсудны Бухарын, рабілі на гэтым працэсе не раз спробы захаваць, як гавораць французы, добрую міну пры дрэннай ігры, прыняць выгляд «ідэйных» людзей, прыкрыць сваю бандыцкую крымінальную дзейнасць усякага роду «філасофскімі», «ідэалагічнымі» і т. п. размовамі.

Бухарын прабаваў тут увесь кашмар сваіх гнусных злачынстваў звесці да нейкіх «ідэйных установак», аб якіх ён прабаваў гаварыць доўгія напышчаныя прамовы. Бухарын гаварыў тут аб падзяленні працы ў гэтай шпіёнска-шкодніцкай арганізацыі, аб якіхсьці «праграмных пунктах», аб нейкай «ідэйнай арыентацыі», хаця — дадаваў ён — ідэйнай арыентацыі на кулацтва

Блок — гэта агентура замежных разведак. Члены блока і яго кіраўнікі накшталт Троцкага, які не сядзіць тут на лаве падсудных, Бухарына, Рыкава, Ягоды, Крэсцінскага, Розенгольца і радавыя яго члены накшталт Зубарэва, Максімава-Дзікоўскага і іншых — гэта рабы гэтых разведак, гэта нявольнікі сваіх гаспадароў.

Філасофія і шпіянаж, філасофія і шкодніцтва, філасофія і дыверсіі, філасофія і забойствы — як геній і зладзейства — дзве рэчы несумяшчальныя.

Я не ведаю іншых прыкладаў, — гэта першы ў гісторыі прыклад таго, як шпіён і забойца арудуе філасофіяй, як таўчоным шклом, каб запарашыць сваёй ахвяры вочы перад тым, як размажыць ёй галаву разбойніцкім кісцянём!

„Права-трацкісцкі блок“—агентура замежных разведак

«Права-трацкісцкі блок», які сядзіць зараз на лаве падсудных,— як гэта з усёй відавочнасцю паказала судовае следства, — гэта толькі перадавы атрад міжнароднага фашызма, гэта — зграя катаў і падпольных забойцаў, пры дапамозе якіх арудуе фашызм у розных краінах, у першую чаргу ў Іспаніі і Кітаі.

Вось чаму выкрыццё «права-трацкісцкага блока», як шпіёнскай банды, мае велізарнае значэнне не толькі для нашай соцыялістычнай рэволюцыі, яно мае велізарнае значэнне для ўсяго міжнароднага пролетарыята. Яно мае велізарнае значэнне для справы міру ва ўсім свеце. Яно мае велізарнае значэнне для ўсёй чалавечай культуры, для барацьбы за сапраўдную дэмакратыю і свабоду народаў, для барацьбы з усімі і ўсякімі падпальшчыкамі вайны, з усімі міжнароднымі правакацыямі і правакатарамі.

Вось чаму за ходам гэтага працэса з трэпетнай увагай сочаць працоўныя масы ўсіх краін свету, асабліва-ж тых краін, дзе народ вядзе гераічную барацьбу за сваю свабоду супроць фашысцкага ярма.

Бухарыны і рыкавы, ягоды і буланавы, крэсцінскія і розенгольцы, ікрамавы, шаранговічы, хаджаевы і іншыя— гэта тая-ж пятая калона, гэта той-жа ПОУМ, гэта той-жа Ку-Клукс-Клан. Гэта адзін з атрадаў фашысцкіх правакатараў і падпальшчыкаў вайны, якія дзейнічаюць на міжнароднай арэне.

Разгром гэтага атрада — вялікая паслуга справе міру, справе дэмакратыі, справе сапраўднай чалавечай культуры.

Выключнае значэнне гэтага працэса, аднак, не абмяжоўваецца сказаным.

Тут, на лаве падсудных, сядзіць не адна якая-небудзь антысовецкая група, агентура не адной якой-небудзь замежнай разведкі. Тут, на лаве падсудных, сядзіць цэлы рад антысовецкіх груп, уяўляючых сабой агентуру разведак цэлага раду варожых да СССР замежных дзяржаў.

У гэтай «справе» завязлі астаткі ўсіх антысовецкіх сіл, груп і арганізацый, завязлі, па крайней меры, як гэта з дакладнасцю ўстаноўлена судовым следствам, чатыры замежныя разведкі: японская, германская, польская і англійская і, зразумела, усе іншыя замежныя разведкі, якія падтрымліваюць з указанымі разведкамі прыяцельскі, так называемы, аператыўны кантакт.

На самой справе, калі гаварыць аб Троцкім, то яго сувязь з Гестапо была вычарпальна даказана ўжо на працэсах трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра ў жніўні 1936 года і антысовецкага трацкісцкага цэнтра ў студзені 1937 года. Цяпер-жа даказана, што яго сувязі з нямецкай палітычнай паліцыяй і разведкамі іншых краін адносяцца да значна больш ранняга перыяду часу, што Троцкі быў звязан з германскай разведкай ужо з 1921 г.

Аб гэтым зусім дакладна паказаў Крэсцінскі на цяперашнім судовым працэсе. Цяпер даказана, што Троцкі быў звязан з англійскай разведкай «Інтэліджэнс-Сервіс» з 1926 года. Аб гэтым дакладна паказаў — і гэта даказана, — абвінавачваемы Ракоўскі. Увесь блок на чале з Троцкім цалкам складаўся з адных замежных шпіёнаў і царскіх ахраннікаў.

Бухарын і Рыкаў праз сваіх саўдзельнікаў былі звязаны з радам замежных разведак, якіх яны сістэматычна абслугоўвалі.

Ягода, як мухамі, быў аблеплен германскімі, японскімі і польскімі шпіёнамі, якіх ён не толькі прыкрываў, як гэта ён сам тут прызнаў, але праз якіх ён вёў шпіёнскую работу, перадаючы разведкам сакрэтныя дзяржаўныя матэрыялы, здраджваючы і прадаючы нашу краіну гэтым замежным разведкам.

Крэсцінскі, па ўласнаму прызнанню, — германскі шпіён з 1921 года.

Розенгольц — адзін з кіраўнікоў трацкісцкага падполля, як устаноўлена, пачаў сваю шпіёнскую работу для германскага генеральнага штаба, як ён сам прызнаў, у 1923 годзе, а для англійскай разведкі, як ён сам таксама прызнаўся ў гэтым злачынстве, — у 1926 годзе.

Ракоўскі — адзін з бліжэйшых і асоба давераных людзей Троцкага, па яго ўласных паказаннях, з'яўляўся агентам англійскай разведкі «Інтэліджэнс-Сервіс» з 1924 года і агентам японскай разведкі з 1934 года.

Чэрноў пачаў сваю шпіёнскую работу ў карысць Германіі, па яго ўласнаму паказанню, у 1928 годзе, звязаўшыся з германскай разведкай па ініцыятыве і пры садзейнасці небезвядомага эмігранта-меншавіка Дана.

Шаранговіч быў завярбован і перакінут польскай разведкай для шпіёнскай работы ў СССР у 1921 годзе.

Грынько, па яго ўласных словах, стаў шпіёнам германскай і польскай разведак у 1932 годзе, а да гэтага падтрымліваў шпіёнскую сувязь з гэтымі разведкамі, асабліва з польскай разведкай.

Ікрамаў і Хаджаеў праз сваіх курбашы «працуюць» пад кіраўніцтвам Бухарына над арганізацыяй сувязяў з рэзідэнтамі англійскай разведкі, над умацаваннем якой нямала папрацаваў на Сярэдне-Азіяцкіх граніцах СССР небезвядомы разведчык і авантурыст Лоурэнс.

Потым ідуць правакатары і агенты царскай ахранкі — Зеленскі, Зубарэў, Іваноў. Іваноў да таго-ж яшчэ і англійскі шпіён.

Далайце да гэтай кампаніі групу атрупіцеляў — забойцаў Левіна, Плетнёва, Казакова, Кручкова, Максімава-Дзікоўскага і іншых звязаных з імі, і тады маральна-палітычнае аблічча гэтага блока і кожнага з яго ўдзельнікаў стане ясным да прадзелу.

Вось чаму мы можам сказаць — вось смярдзючая куча чалавечых адкідаў, не спыняўшыхся ні перад чым, не грэбаваўшых нічым, гатовых на ўсё — на ўзрывы заводаў і чыгуначных паяздоў, на знішчэнне жывёлы, на псаванне хлеба, на забойства, шпіянаж і здраду.

Перад усім светам выкрываецца цяпер прэзрэнная, здрадніцкая, бандыцкая дзейнасць бухарыных, ягод, крэсцінскіх, рыкавых і іншых права-трацкістаў. Яны прадавалі радзіму, гандлявалі ваеннымі тайнамі яе абароны, яны былі шпіёнамі, дыверсантамі, шкоднікамі, забойцамі, зладзеямі — і ўсё для таго, каб дапамагчы фашысцкім урадам звергнуць совецкі ўрад, звергнуць уладу рабочых і сялян, аднавіць уладу капіталістаў і памешчыкаў, расчляніць краіну совецкага народа, адтаргнуць нацыянальныя рэспублікі і ператварыць іх у калоніі імперыялістаў.

Такі быў загад іх гаспадароў, і яны выконвалі гэты загад як маглі, стараючыся з усіх сіл.

Такавы гэтыя людзі, такавы іх планы і разлікі, такавы іх ганебныя і страшэнныя злачынствы.

Падсудны Бухарын хвасліва гаварыў тут, што гэта яны, правыя, капіталістычныя падпявалы, узброілі трацкізм «духоўнай» зброяй тэорыі рэстаўрацыі капіталізма.

Аб якой «тэорыі» гаворыць Бухарын, гэты пражжоны палітычны плут і адзін з буйнейшых арганізатараў замежнага шпіянажу супроць СССР? Як чорт ад ладана, Бухарын бяжыць ад прызнання сваей віны. Бухарын адмаўляе тут сваю віну.

Што варта гэта адмаўленне ў святле маючыхся ў нас супроць Бухарына доказаў?

Напомню толькі, што на ранішнім пасяджэнні 7-га сакавіка Бухарын і Рыкаў былі поўнасцю ўлічаны ў шпіёнскіх сувязях і ў шпіёнскай рабоце ў карысць германскай і польскай разведак.

Значэнне цяперашняга судовага працэса вызначаецца, зразумела, і тымі ўрокамі, якія непазбежна, неабходна засвоіць усім нам, патрыётам совецкай зямлі з гэтага працэса.

Наша радзіма карыстаецца шчасцем соцыялістычнай перамогі, шчасцем і радасцю вызваленай ад капіталістычнага ярма працы.

Дваццаць год стаіць, як несакрушальны ўцёс, совецкая дзяржава — соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян.

Дваццаць год упарта і настойліва ідзе дружная работа шматлікіх народаў, аб'яднаўшыхся ў брацкі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, пабудаваны геніем правадыроў соцыялістычнай рэволюцыі Леніна і Сталіна.

За гэтыя дваццаць год калісьці бедная і слабая краіна ператварылася ў краіну багатую і моцную, у краіну магутную і непераможную.

За гэтыя дваццаць год расійская дзяржава ператварылася ў дзяржаву соцыялістычную.

Соцыялізм увайшоў у быт нашага народа, соцыялізм перамог у нашай краіне. І няма сілы ў свеце, якая магла-бы аслабіць значэнне або веліч гэтай соцыялістычнай перамогі. І гэта, не гледзячы на ўсе труднасці, якія стаялі і яшчэ стаяць на нашым шляху. І гэта, не гледзячы на ўсе намаганні варожых нам замежных дзяржаў і аджыўшых і паміраючых астаткаў эксплаататарскіх класаў у нашай краіне затрымаць прагрэсіўнае развіццё нашага грамадства, перашкодзіць нашым соцыялістычным поспехам, сарваць нашу мірную творчую работу па пабудове ў СССР соцыялізма.

Можна без усякага перапавелічэння сказаць, што за прайшоўшыя 20 год совецкай гісторыі наша дзяржава і наш народ не ведалі ні аднаго года, ні аднаго месяца і дня, калі-б не нападалі на нас ворагі.

Ад першых дзён вялікага Кастрычніка да бліскучых дзён найвялікшай з гістарычных эпох — эпохі Сталінскай Канстытуцыі — маладая рэспубліка советаў не выходзіць з агню класавага нападу эксплаататараў і іх незлічонай агентуры — трацкістаў, меншавікоў, эсэраў, бухарынцаў, зіноўеўцаў, мусаватыстаў, дашнакоў, грузінскіх, узбекскіх і іншых нацыяналістаў, чорнасоценцаў, белагвардзейцаў, кадэтаў, папоў, кулакоў і т. д. і т. п.

Гэты працэс яшчэ раз нам напомніў, і пры тым напомніў з набывалай сілай і вастрынёй, што два светы стаяць, як непрымірымыя і смяротныя ворагі адзін перад адным — свет капіталізма і свет соцыялізма.

На небяспеку для справы соцыялізма ў СССР капіталістычнага акружэння не раз зварачалі нашу ўвагу нашы настаўнікі Ленін і Сталін.

Таварыш Сталін гэтымі днямі яшчэ раз напомніў нам аб капіталістычным акружэнні.

«На самой справе, — пісаў таварыш Сталін у сваім гістарычным адказе тав. Іванову, — было-б смешна і глупа закрываць вочы на факт капіталістычнага акружэння і думаць, што нашы ўнешнія ворагі, напрыклад, фашысты не паспрабуюць пры выпадку зрабіць на СССР ваенны напад. Так могуць думаць толькі сляпыя бахвалы або скрытыя ворагі, якія жадаюць усыпіць народ. Не менш смешным было-б адмаўляць, што ў выпадку малейшага поспеху ваеннай інтэрвенцыі інтэрвенты паспрабуюць разбурыць у занятых імі раёнах совецкі лад і аднавіць буржуазны лад. Хіба Дзенікін або Калчак не аднаўлялі ў занятых імі раёнах буржуазны лад? Чым фашысты лепш Дзенікіна або Калчака? Адмаўляць небяспеку ваеннай інтэрвенцыі і спроб рэстаўрацыі пры існаванні капіталістычнага акружэння могуць толькі галавацяпы або скрытыя ворагі, якія жадаюць прыкрыць бахвальствам сваю варожасць і стараюцца дэмабілізаваць народ».

На поспех інтэрвенцыі на працягу раду год спадзяваліся нашы ворагі, арганізоўваючы і натхняючы на барацьбу з совецкай уладай розныя антысовецкія групы ўнутры СССР, разлічваючы пры дапамозе гэтых груп ажыццявіць свой разбойніцкі замысел. Ні адна колькі-небудзь сур'ёзная змова супроць совецкай улады ў СССР не абышлася без прамога і самага актыўнага ўдзелу ў ёй замежных капіталістаў і ваеншчыны.

Вядома, што і шахцінцы і промпартыйцы не толькі займаліся шкодніцтвам і рыхтавалі на выпадак вайны дыверсійныя акты, але сістэматычна вялі шпіёнскую работу, прычым, як гэта высветлілася па справе «Промпартыі», для вядзення гэтай шпіёнскай работы Рамзін арганізаваў нават асобую камісію пад старшынствам шкодніка прафесара Асадчага, які быў у той час намеснікам старшыні Дзяржплана. У праграме «Промпартыі» завастралася ўвага на дыверсіях у Маскве, Ленінградзе, Данбасе, на Урале шляхам узрываў мастоў, псавання чыгуначных пуцей, узрываў электрастанцый, спынення заводаў і фабрык.

Гэта-ж поўнасцю паказаў і цяперашні судовы працэс, галоўнымі «героямі» якога з'яўляюцца арганізатары і натхніцелі «права-трацкісцкага блока», выкрытыя як закаранелыя ворагі соцыялізма, нашай радзімы, нашага народа.

Гэты працэс падводзіць вынік барацьбы супроць совецкай дзяржавы і партыі Леніна—Сталіна людзей, якія, як гэта з выключнай яркасцю і перакана́ўчасцю даказала судовае следства, усё сваё жыццё хадзілі пад маскай, якія пачалі гэту барацьбу задоўга да цяперашняга часу, якія, пад прыкрыццём громкіх правакатарскіх фраз, служылі не рэволюцыі і пролетарыяту, а контррэволюцыі і буржуазіі, якія ашуквалі партыю, совецкую ўладу, каб зручней рабіць сваю чорную справу здрады, каб далей аставацца нявыкрытымі.

Прэзрэнныя злачынцы шляхам ашуканства, крывадушша і двурушніцтва сумелі адтэрмінаваць да апошняга часу гадзіну свайго выкрыцця. Але гадзіна гэта настала, і злачынцы выкрыты, выкрыты поўнасцю і да канца.

Маска сарвана. Іх сапраўдны твар, іх сапраўднае аблічча ясна цяпер кожнаму. Кожнаму ясны і іх ганебныя справы, як ясны іх нікчэмны, ганебны лёс.

Цяперашні працэс поўнасцю і да канца выкрыў зараз як фашысцкую агентуру, не толькі трацкістаў, але і бухарынцаў, на працягу доўгага часу майстэрскі маскіраваўшыхся, майстэрскі пазбягаўшых свайго выкрыцця, як забойцаў, шпіёнаў і правакатараў.

Цяпер канчаткова высветліўся ўвесь працэс гэтага іх ператварэння ў контррэволюцыйную шайку, ператварэння намеціўшагася ўжо даўно і неаднаразова выкрытага нашай партыяй і асабіста таварышам Сталіным.

Пачаўшы ў 1918 годзе са змовы супроць Леніна, як главы совецкага ўрада, падняўшы ў 1918 годзе сваю злачынную руку на Леніна, ці мог кончыць Бухарын інакш, чым кончыў зараз, — гэтай ганебнай лавай падсудных, чакаючы суровага, але справядлівага суда совецкага народа, з праклянцем вымаўляючага зараз гэта ненавіснае імя!

Пачаўшы са знахарскай «тэорыі» аб мірным урастанні кулакоў у соцыялізм, вядучы ўсе гэтыя апошнія дзесяць год падпольную барацьбу з партыяй і совецкім народам, ці мог інакш кончыць сваю палітычную кар'еру Бухарын, чым ён яе канчае, крыўляючыся і фіглярнічаючы нават зараз на парозе сваёй, можа быць, апошняй, смяротнай гадзіны!

На XVI з'ездзе партыі ў 1930 годзе таварыш Сталін, выкрываючы дваістасць трацкізма, указваў, што гэтай дваістасцю ...«тлумачыцца той факт, што свае «шалёныя», быццам-бы, атакі супроць правых ухілістаў трацкізм» (гэта капітулянцтва пад маскай) «звычайна ўвенчвае **блокам** з імі, як з капітулянтамі без маскі».

Трацкісты і правыя — гэта капітулянты. Адны капітулянты пад маскай істэрычных, правакацыйных, «рэволюцыйных» фраз, другія — капітулянты без маскі.

Чым тлумачыцца гэта сваяцтва пазіцый трацкістаў і правых, іх пастаяннае цягаценне аднаго да другога, пастаяннае шуканне блокаў, нарэшце, наяўнасць гэтых блокаў на розных этапах іх барацьбы супроць партыі, совецкай дзяржавы і соцыялістычнага будаўніцтва?

Гэта, зразумела, тлумачыцца перш за ўсё агульнасцю соцыяльнай базы трацкістаў і правых. Гэта тлумачыцца тым, што і трацкісты, і правыя адлюстроўваюць даўленне капіталістычных элементаў, якія супраціўляюцца поспехам соцыялізма, не збіраюцца мірна і ціха ўходзіць з гістарычнай сцэны.

Гэта тлумачыцца, як мы ведаем цяпер, тым, што і адны і другія дзейнічалі па загаду адных і тых-жа гаспадароў, якія сядзяць у генштабах і разведках варожых да СССР замежных дзяржаў.

Трацкісты і бухарынцы ўжо многа год назад апынуліся ў лагеры контррэволюцыі. Трацкізм і правыя ператварыліся ўжо многа год таму назад у зброеносцаў буржуазнай контррэволюцыі. Трацкісты і правыя снабжаюць ужо на працягу многіх год контррэволюцыйную буржуазію зброяй для барацьбы з совецкай дзяржавай. Трацкісты і правыя робяць адну і тую-ж чорную справу здрады.

Факты ўстанаўліваюць з поўнай бясспрэчнасцю як непазбежнасць і натуральнасць блока, заключанага правымі і трацкістамі, так і ператварэнне гэтага блока ў агентуру замежных фашысцкіх разведак.

Як змагаліся права-трацкісты супроць В. І. Леніна, супроць справы соцыялізма

Я хацеў-бы зараз напомніць некаторыя факты, характарызуючыя з гэтага пункту гледжання пазіцыю і паводзіны некаторых герояў цяперашняга працэса і ў першую чаргу падсудных Бухарына і Рыкава.

Некалькі кароткіх даведак.

1909 год — Бухарын далучаецца да адзавізма.

1914—1917 гг. (перыяд імперыялістычнай вайны) — Бухарын «левы комуніст», адмаўляе праграму-мінімум, вядзе барацьбу супроць Леніна.

1914 год — ён носіцца з планам выдання ўласнай газеты, процістаўляючы яе большэвіцкаму друку, ленінскаму друку.

Вясна 1915 года — Бухарын трацкіст. На Бернскай канферэнцыі ён выступае супроць лозунга грамадзянскай вайны, за адзінства з трацкісцка-меншавіцкім «Нашым словам». Ленін піша артыкул «Аб нацыянальнай гордасці велікаросаў», Бухарын трактуе гэта як праяўленне соцыял-патрыятызма.

Восень 1915 года — Бухарын выступае з тэзісамі, адвяргаючымі права нацый на самавызначэнне.

Люты 1916 года — Бухарын салідарызуецца з поўанархічнай праграмай галандскіх левых соцыял-дэмакратаў.

У 1916 годзе Бухарын выступае ў журнале «Интернационал молодежи» з анархічнымі, антыленінскімі поглядамі па пытанню аб дзяржаве, супроць дыктатуры пролетарыята.

У артыкуле «Мировое хозяйство и империализм» (1915 г.) Бухарын адкрыта абараняе трацкісцкі тэзіс аб тым, што разрозненыя выступленні пролетарыята асобных краін перамагчы не могуць. Інакш кажучы, як гаварыў Ленін, бухарыны адкладвалі соцыялізм... «да грэчаскіх календ, г. зн. да «ніколі» (Ленін, т. XIX, стар. 221). Уладзімір Ільіч пісаў аб ім у 1916 годзе, што ён — Бухарын «(1) даверлівы да плётак і (2) у палітыцы д'явальска **няўстойлівы**» (Ленін, т. XXIX, стар. 229).

«Вайна, — пісаў Ленін, — штурхнула яго да ідэй поўанархічных. На нарадзе, вынесшай бернскія рэзалюцыі (вясна 1915 г.), ён даў тэзісы... — верх недарэчнасці; срам; поўанархізм».

У 1916 годзе, як я ўжо сказаў, у журнале «Интернационал молодежи» Бухарын развіваў анарха-сіндыкалісцкія мыслі аб прынцыповай варожасці пролетарыята да дзяржавы, аб узрыве усякай дзяржавы.

У выніку, праз год пасля смерці В. І. Леніна, Бухарын выступіў з наглым сцверджаннем, што ў гэтым пытанні памыляўся не ён, Бухарын, а Ленін.

1916—1917 гг. — Бухарын разам з Троцкім рэдагуе трацкісцкую газету «Новый мир» (Нью-Ёрк), у якой адмаўляе магчымасць перамогі соцыялізма ў адной краіне.

1917 год — на VI з'ездзе партыі Бухарын выступае з трацкісцкай схемай. У дні Кастрычніка зноў і зноў адстойвае немагчымасць перамогі соцыялізма ў Расіі.

1918 год — Бухарын лідэр «левага комунізма». Гэты эпізод з усёй дакладнасцю разгледжан на судовым пасяджэнні.

8-га кастрычніка 1918 года на пленуме Моссовета Бухарын заяўляе аб памылковасці свайго «левага комунізма». Мы ведаем, што на судзе Бухарын павінен быў прызнаць, што на справе ён актыўна змагаўся за зрыў Брэсцкага міру.

1919 год — VIII з'езд партыі — Бухарын зноў выступае супроць прызнання права нацый на самавызначэнне.

Далей ідуць IX, X з'езды партыі, дзе Бухарын нязменна вядзе «сваю» лінію, накіраваную супроць партыі, супроць Леніна, супроць Сталіна.

У 1921 годзе Бухарын у інтарэсах Троцкага займае пазіцыю буфера, здрадніцка распальваючы дыскусію, падліваючы ў яе, па выразу Леніна, «буферны карасін».

У антыленінскай фракцыі Бухарын выступае разам з Серэбраковым, Радэкам, Крэсцінскім, Пятаковым і іншымі трацкістамі.

Канец 1920 года — пачатак 1921 года — ідзе дыскусія аб профсаюзах. Краіна рыхтуецца к пераходу да новай эканамічнай палітыкі. Бухарын выступае ў ролі «буфера», затым поўнасцю пераходзіць на пазіцыі Троцкага. А на X з'ездзе заяўляе, што «рэспубліка вісіць на валаску».

У 1922 годзе Ленін граміць Бухарына за яго спробу сарваць манаполію ўнешняга гандлю. Ленін прама выкрывае Бухарына, як спекулянта, дробнага буржуа, як абаронцу інтарэсаў кулацкай верхавінкі сялянства. (Ленін, т. XXVII, стар. 381).

У 1923—24 гг. Бухарын блакіруецца з Каменевым і Зіноўевым супроць таварыша Сталіна.

1925 г. — кулацкі лозунг Бухарына «Узбагачайцеся».

1928 г. — Бухарын заяўляе на пленуме ЦК партыі аб адсутнасці рознагалоссяў з партыяй і адначасова вядзе перагаворы і ўступае ў тайны зговар з Каменевым. Піша «Заметкі эканаміста».

1929 г. — Бухарын у «Правде» заяўляе аб памылковасці сваіх поглядаў. Цяпер на судзе ён паказаў, што і гэта быў тактычны манеўр, што і тады ў 1929 г. ён таксама хлусіў. Бо якраз у гэты час афармлялася падпольная арганізацыя, якая са зброяй у руках стала выступаць супроць совецкай улады.

Каб не быць галаслоўным, я напомню вам паказанні Бухарына, Рыкава, нарэшце, Іванова аб тым, як Бухарын распальваў барацьбу на Паўночным Каўказе, як праз свайго вучня і падручнага ў гэтай справе Слепкова ён арганізоўваў кулацкія паўстанні супроць совецкай улады, як пасылаў Якавенка ў Сібір, як ім усім удалося справакаваць кулацкае паўстанне ў Бійскай акрузе і іншых месцах. Напомню, што ў гэты-ж самы час Бухарын, выступаючы ў друку, гаварыў: «Прыкладзем усе намаганні да таго, каб разам з усёй партыяй павесці рашучую барацьбу супроць усіх ухілаў» Бухарын хлусіў і тут.

15 снежня 1929 года Бухарын змяшчае ў «Правде» артыкул, у канцы якога пералічае і асуджае свае памылкі. І ў той-жа самы час ён вядзе падпольныя размовы з Каменевым.

Ён заключыў блок са злейшымі, выкрытымі ворагамі большэвізма, толькі што ў лістападзе 1927 года выступаўшымі супроць совецкай улады з антысовецкай дэманстрацыяй на вуліцах Масквы і Ленінграда.

У 1930 годзе Бухарын зноў падае заяву ў ЦК і прызнае свае памылкі. А на справе, вы чулі з паказанняў Бухарына, на справе ён іменна ў гэты час вёў перагаворы з Сямёнавым аб арганізацыі тэрарыстычнага акта супроць кіраўнікоў нашай партыі і ўрада.

У студзені 1933 года Бухарын на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК ВКП(б) («Правда», № 14) выступае з прамовай, у якой патрабуе суровай расправы з групоўкай А. П. Смірнова, гаворыць аб сваёй права-апартуністычнай, зусім няправільнай агульнапалітычнай ўстаноўцы, аб сваёй віне перад партыяй, яе кіраўніцтвам, перад Цэнтральным Камітэтам партыі, перад рабочым класам і краінай.

А на справе гэта быў першы год афармлення «права-трацкісцкага блока», які прыступіў да выканання такіх задач, як тэрор, шпіянаж, дыверсіі, шкодніцтва, здрада радзіме, адтаржэнне ад СССР нацыянальных рэспублік.

Пачатак 1934 года — XVII з'езд партыі — выступленне Бухарына, у якім ён адабрае «бязлітасны разгром усіх апазіцый і правай апазіцыі, як галоўнай небяспекі, г. зн. той самай групоўкі, да якой я калісьці належаў».

А ў гэты-ж час мабілізуе ўсе сілы для таго, каб узмацніць злачынныя дзеянні сваёй групы, якая ператварылася ўжо ў групу сапраўдных шпіёнаў, забойц, разведчыкаў.

Пачатак 1936 года — Бухарын ў артыкуле ў «Известиях» абазваў рускі народ «нацыяй абломавых». У нумары «Известий» ад 14 лютага 1936 года Бухарын заяўляе аб памылковасці гэтага свайго сцвярджэння.

Такі Бухарын — гэта крывадушная, ілжывая, хітрая натура. Гэты благачэсціва-драпежны і шаноўна злы чалавек, гэта, як гаварыў Максім Горкі пра аднаго з герояў з галерэі «былых людзей», — «праклятая сумесь лісіцы і свінні».

Не лепш і іншыя — таксама «героі». Падсудны Рыкаў. Да ўступлення ў партыю большэвікоў Рыкаў уваходзіў у Саратаве ў аб'яднаную партыю эсэраў і соцыял-дэмакратаў.

1909—1911 гг. — Рыкаў поўтрацкіст, поўліквідатар.

У перыяд Красавіцкай канферэнцыі Рыкаў і Каменеў за аб'яднанне «жывых сіл» рэволюцыйнай дэмакратыі, г. зн. за саюз з эсэрамі і меншавікамі.

У кастрычніку 1917 года разам з Каменевым, Зіноўевым Рыкаў дэзерціруе.

У снежні 1917 года Рыкаў каркае аб нетрываласці совецкай улады, гаворачы, што «не можа ўтрымацца чыста большэвіцкая ўлада ў адсталай краіне ў той час, як у Еўропе не адбылася соцыялістычная рэволюцыя».

У 1920 годзе Рыкаў з сапронаўцамі выступае супроць Леніна, за калегіяльнасць.

Рыкаў супроць ленінскага плана ГОЭЛРО, ён пагруз з галавой у абывацельскім «рэалізме», пагруз па-вушы ў руціне (як пісаў аб ім тады В. І. Леніну таварыш Сталін).

А потым? Потым 1928, 1929, 1932 гг. — блокі, цэнтры, змовы, здрада.

Іншыя абвінавачваемыя не лепш.

Вось стары трацкіст і германскі шпіён Крэсцінскі, пачаўшы сваю здрадніцкую кар'еру яшчэ пры жыцці Уладзіміра Ільіча Леніна. Крэсцінскі перадае шпіёнскія весткі нямецкай разведцы і атрымлівае штогод па 250.000 марак золатам ад германскага рэйхсвера ў карысць падпольнай трацкісцкай работы. Вось такі-ж мацёры, трацкіст Розенгольц, які быў германскім шпіёнам з 1923 г. і англійскім шпіёнам з 1926 г.

(Працяг на 3-й стар.)

*) Скарочаная стэнаграма.

ПРАЦЯГ ПРАМОВЫ тав. А. Я. ВЫШЫНСКАГА

Змова супроць В. І. Леніна у 1918 годзе

Я лічу неабходным коратка спыніцца на моўшым тут месца даследванні акалічнасцей змовы супроць Уладзіміра Ільіча Леніна ў 1918 годзе.

І на папярэднім следстве і на судзе Бухарын прабаваў усяляк адкруціцца ад 1918 года, уйсці ад адказнасці перад гісторыяй, перад рабочым класам, перад усім чэсным чалавецтвам за страшэннае злачынства, арганізаванае Бухарыным разам з «левымі» і правымі эсэрамі, разам з Троцкім і яго групай і часткова ажыццёўленае.

Трэба ўспомніць факты, абстаноўку і ўмовы 1918 года, каб па дастоінству ацаніць усю глыбіню адскага злачынства Троцкага і Бухарына супроць рэвалюцыі, усю глыбіню іх здрадніцтва!

1918 год. Маладая савецкая рэспубліка напружвае ўсе свае сілы, каб перамагчы гігантскія труднасці, якія сталі на яе шляху да зацвярджэння і замацавання перамогі соцыялістычнай рэвалюцыі.

У гэтых умовах барацьба за мір з'ўлялася барацьбой за ўсю будучыню пралетарскай рэвалюцыі, лёс якой быў у літаральным сэнсе гэтага слова пастаўлен на карту.

У гэтых умовах пытанне аб вайне і міры зводзілася па сутнасці да аднаго пытання — **быць ці не быць савецкай уладзе, савецкай дзяржаве, савецкай краіне.**

Геніяльная ленінская стратэгія вырашыла гэтае пытанне станоўча. Гісторыя пацвердзіла правільнасць гэтага рашэння. Яна сказала «быць».

Ленінізм вучыць не толькі майстэрству наступлення, але і майстэрству адступлення.

«...Нельга, — пісаў Ленін, — перамагчы, не навучыўшыся правільнаму наступленню і правільнаму адступленню» (Т. XXV, стар. 177).

У 1924 годзе таварыш Сталін напомніў па гэтаму повадзу:

«Цяпер нават апошні дурань» бачыць, — гаварыў Ленін праз тры годы пасля Брэсцкага міру, — «што «Брэсцкі мір» быў уступкай, узмацніўшай нас і раздрабіўшай сілы міжнароднага імперыялізма» («Пытанні Ленінізма», стар. 57).

Вядома, што Троцкі і Бухарын са сваімі прыхільнікамі ўсяляк стараліся сарваць Брэсцкі мір.

Троцкі і «левыя» эсэры, пры перагаворах з генералам Гофманам, вялі сябе, як правакатары. «Левыя комуністы» на чале з Бухарыным рвалі і мяталі супроць мірнай палітыкі савецкага ўрада на чале з Леніным, Сталіным і Свердловым, патрабуючы разрыву перагавораў і аб'яўлення «рэвалюцыйнай вайны».

Сваімі хлёсткімі, а па сутнасці справы правакатарскімі прамовамі і лозунгамі, бухарынцы і трацкісты прабавалі збіць нашу партыю з ленінскага шляху.

Нават на папярэднім следстве ў паказаннях ад 2 чэрвеня 1937 года Бухарын прабаваў утоіць сапраўдны характар сваёй барацьбы ў перыяд Брэсцкага міру супроць Леніна, як главы савецкай дзяржавы.

Следства ўстанавіла, і я лічу неабходным гэта вам тут напомніць, таварышы суддзі, у поўным аб'ёме, што ў 1918 годзе, непасрэдна следам за Кастрычніцкай рэвалюцыяй, у перыяд заключэння Брэсцкага міру, Бухарын і яго група так называемых «левых комуністаў» і Троцкі з яго групай, сумесна з «левымі» эсэрамі, арганізавалі змову супроць Леніна, як главы савецкага ўрада.

Бухарын і іншыя змоўшчыкі, як гэта відаць з матэрыялаў следства, мелі сваёй мэтай сарваць Брэсцкі мір, звергнуць савецкі ўрад, арыштаваць і забіць Леніна, Сталіна і Свердлова і сфармаваць новы ўрад з бухарынцаў, якія тады для маскіроўкі называлі сябе «левымі комуністамі», трацкістаў і з «левых» эсэраў.

Мы памятаем сведкаў, якія прайшлі перад судом, добра памятаем іх паказанні, мы іх бачылі, мы іх чулі. Мы памятаем, як цяжкім свінцом падалі іх словы на галаву Бухарына, натхніцеля правакатарскай барацьбы супроць ленінскага Совета Народных Камісараў, Бухарына — арганізатара, як гэта з поўнай відавочнасцю устаноўлена і судовым следствам, змовы і паўстання супроць савецкай дзяржавы, падбухторшчыка да забойства кіраўнікоў савецкага ўрада таварышаў Леніна, Сталіна і Свердлова.

Вы памятаеце тут паказанні Камкова. Камкоў — адзін з віднейшых кіраўнікоў ЦК партыі «левых» эсэраў. Камкоў паказваў, што ён з Бухарыным вёў разгавор у 1918 годзе па пытанню аб Брэсцкім міры, што барацьба, па словах Бухарына, прымае па гэтаму пытанню надзвычай вострыя формы. Бухарын гаварыў Камкову аб вострых формах, аб тым, што дэбатыруецца ў радах «левых комуністаў» пытанне аб стварэнні новага ўрада. Пры гэтым, сказаў Камкоў, Бухарын назваў Пятакова як магчымага кандыдата ў кіраўнікі новага ўрада і заявіў, што сама змена ўрада мысліцца шляхам арышту ўсяго склада савецкага ўрада на чале з Леніным.

Бухарын гэта не адмаўляў. Але Бухарын адхрышчваецца ад плана забойства нашых правадыроў.

Якія ён прадставіў у сваё апраўданне доказы па гэтаму пытанню? Ніякіх, апрача голага адмаўлення. Яго выкрывала тут Якаўлева, яго выкрываў тут Осінскі, яго выкрываў тут Манцэў, яго выкрываў тут Карэлін.

Бухарын адмаўляе. Але нельга-ж на самой справе лічыць за аргумент нічым не матываванае адмаўленне тым больш, што гэта адмаўленне супярэчыць самой логіцы рэчаў.

Калі-б гэтага факта — плана забойства Леніна, Сталіна і Свердлова — не было, то навошта-б патрабавалася гаварыць аб гэтым і Карэліну, і Якаўлевай, і Осінскаму, і Манцаву людзям не ў інтарэсах якіх сазнаваць зараз такі ганебны і такі страшэнны факт, такое страшэннае злачынства супроць радзімы.

Бухарын прызнаў, што ён разам са сваёй групай «левых комуністаў», з Троцкім і яго групай і з «левымі» эсэрамі зацявалі гвалтоўнае звяржэнне савецкага ўрада на чале з Леніным, Сталіным і Свердловым і навет арышт Леніна, Сталіна і Свердлова.

Але ці ведае Бухарын, што азначае гвалтоўнае звяржэнне? Ці ведае Бухарын, што азначаюць арышты, звязаныя з задачай гвалтоўнага звяржэння? Ці ведае Бухарын, што людзі, якія ідуць на гвалтоўнае звяржэнне і на гвалтоўны арышт, тым самым ідуць на гвалт, тым самым ідуць і на забойства!

Бухарын прызнаў, ды і то, як вы бачылі на судовым следстве, толькі поўпрызнаў таму, што яму падацца няма куды, што ў 1918 годзе Бухарын абвяшчаў савецкую ўладу фармальнай і прапаноўваў не ліквідаваць.

Следства ўстанавіла, што ў 1918 годзе Бухарын і Троцкі заключылі з эсэрамі блок для сумеснай барацьбы супроць савецкага ўрада, узначальваемага тады Леніным, Сталіным і Свердловым, што яны зацявалі ўзброенае паўстанне, што яны ішлі на арышт і забойства Леніна, Сталіна і Свердлова.

Даказана гэта або не?

Даказана поўнасцю. Даказана паказаннямі самога Бухарына і паказаннямі Якаўлевай і Карэліна, Камкова, Манцэва і Осінскага.

Уся логіка падзей, увесь сэнс гэтай барацьбы, уся жорсткасць той атмасферы, у якой гэта барацьба ішла, уся вастрыня самога пытання — ці быць Брэсцкаму міру, г. зн. ці быць савецкай краіне, краіне, будуючай соцыялістычнае грамадства, або не быць Брэсцкаму міру, не быць савецкай зямлі, якую як «фармальную» яны меркавалі аддаць на разграмленне ворагу, — усё гэта з усёй сур'ёзнасцю гаварыла аб тым, што справа ідзе аб сапраўднай барацьбе, якая заўсёды ў такіх выпадках звязана з немінучасцю прымянення і такой меры, рэзультатам якой з'яўляецца смерць, забойства. Вось чаму я гавару: для мяне не з пункту погляду крыміналогіі, бо зараз, праз 20 год пасля таго, як адбылося гэта злачынства, мы не прад'яўляем Бухарыну самастойнага абвінавачання, — гэта мае значэнне для таго, каб ацаніць тую сувязь, якая існуе паміж змоўніцкай дзейнасцю забойцы і контррэвалюцыянера Бухарына і яго саўдзельнікаў з тым, што яны рабілі ў далейшым. Усё гэта мае значэнне для таго, каб паказаць, што Бухарын і зараз па пытанню, маючаму гістарычны інтарэс і значэнне, не ў стане, не хоча прызнаць усе злачынствы, якія ён зрабіў у сапраўднасці супроць савецкай краіны, супроць савецкай улады і супроць савецкага народа.

Цяпер поўнасцю раскрыта і тое страшэннае злачынства, якое мела месца 30 жніўня 1918 года. Я маю на ўвазе замах на жыццё Владзіміра Ільіча Леніна 30 жніўня 1918 года з боку эсэраўскай тэрарысткі Каплан. Карэлін сцвярджаў тут, што пытанне аб тэрарыстычным акце супроць Леніна, было ўзнята ў 1918 годзе нікім іншым, як іменна Бухарыным. Карэлін сцвярджаў, што Праш'ян дакладваў аб гэтым членам ЦК партыі «левых» эсэраў. Карэлін сцвярджаў, што «такога рода патрабаванне «левых комуністаў», заяўленае Бухарыным, іх главаром адыграла сваю ролю ў сэнсе паскарэння тэрарыстычнага акта супроць Леніна, зробленага ЦК партыі правых эсэраў». Гэта страшэннае злачынства — факт.

Осінскі паказаў са слоў Стукава, што ён — Стукаў быў такой-жа думкі, меў такое-ж уяўленне аб злачынстве 30 жніўня 1918 года.

«У канцы 1918 года Стукаў, — паказваў тут Осінскі, — які разам з Бухарыным быў звязан з эсэрамі, сказаў мне, што стрэл, зроблены правай эсэркай Фаней Каплан у Леніна, быў зроблен не толькі па ўказанню кіраўніцтва правых эсэраў, але і з'явіўся прамым завяршэннем мерапрыемстваў, намечаных у свой час блокам да фізічнага знішчэння Леніна, Сталіна і Свердлова». (Т. 44, л. с. 89).

Гэтыя паказанні дастаткова і пераканаўча гавораць аб той подлай, здрадніцкай, д'явальскай рабоце, якую вёў Бухарын, гэты патэнтаваны ліцамер і іезуіт.

Каб закончыць з характарыстыкай паводзін Бухарына і самага Бухарына, трэба сказаць, што ліцамер'ем і каварствам гэты чалавек пераўзышоў самыя каварныя, страшэнныя злачынствы, якія толькі ведала чалавечая гісторыя.

Тут, на судзе, ён паказаў сябе ўвесь. Мы прасачылі крок за крокам, год за годам палітычнае жыццё Бухарына.

Колькі раз Бухарын кляўся імем Леніна толькі для таго, каб зараз-жа лепш ашукаць і прадаць і партыю, і краіну, і справу соцыялізма.

Колькі раз Бухарын дакранаўся да вялікага настаўніка з лабзаннем Іуды-здрадніка!

Бухарын напамінае Васілія Шуйскага і Іуду Іскарыота, які прадаваў з лабзаннем.

І паводкі ў Нікалая Іванавіча Бухарына якраз, як у Васілія Іванавіча Шуйскага, як малюе яго нам славуты пісьменнік Остроўскі.

«Василий свет-Иваныч,
Что ни начни, все свято у него!
Заведомо мошенничать сберется
Иль видимую пакость норовит,
А сам, глядя, вздыхает с постной рожей
И говорит: «Святое дело, братцы!..»

Так і Бухарын, — школніцтва, дыверсіі, шпіянаж, забойствы арганізуе, а выгляд у яго пакорлівы, ціхі, амаль святы, і быццам чуюцца пакорлівыя словы Васілія Іванавіча Шуйскага: «Святое дело, братцы!» з вуснаў Нікалая Іванавіча.

Вось верх жудаснага ліцамер'я, вераломства, іезуітства і нечалавечай подласці.

Шпіёны, здраднікі, рэстаўратары капіталізма

Устаноўлена на гэтым следстве, што блок меў сваіх сапраўдных гаспадароў у асобе Троцкага і замежных разведак, што ўся яго злачынная дзейнасць ішла пад непасрэдным кіраўніцтвам і па планах, выпрацаваных у генеральных штабах Японіі, Германіі і Польшчы.

Вось паказанні Чэрнова. Чэрноў звязваецца з паліцыяй або праз паліцэйскага чыноўніка ў Берліне з Обергаузам. Обергауз, гаворыць Чэрноў, сказаў мне, што нямецкая разведка прымае належныя меры для звяржэння савецкай улады. І далей, звяртаючыся да Чэрнова, Обергауз гаворыць: «Вось вы лічыце сябе апазіцыяй у Савецкім Саюзе, вам трэба аб'яднаць ў арганізуючую сілу. Калі вы хочаце ўзяць уладу, то не саромцеся ў метадах барацьбы». Гаворачы аб метадах барацьбы, Обергауз прапануе замацаваць сувязь правых з нямецкай разведкай. Ён гаварыў аб тым, што ўся арганізацыя правых можа быць пастаўлена на службу мэтам нямецкай разведкі.

Тут, на судзе, на пытанне, хто быў гаспадарамі, Чэрноў адказаў: «Апрача Рыкава і нямецкай разведкі, — нікога». Ці не ясна, што арганізацыя гэтага так называемага «права-трацкісцкага блока» была ні чым іншым, як экспазітурай некаторых разведак некаторых замежных дзяржаў.

Падсудны Шаранговіч тут поўнасцю пацвердзіў сваю сувязь з генеральным штабам Польшчы. Ён пацвердзіў, што, як глава мясцовай беларускай буржуазна-нацыяналістычнай падпольнай арганізацыі, ён ставіў сваёй задачай абслугоўванне інтарэсаў польскай разведкі і польскага генеральнага штаба.

Асноўныя мэты гэтай арганізацыі? Сам Шаранговіч вызначыў іх коратка: звяржэнне савецкай улады і аднаўленне капіталізма, адтаржэнне Беларусі ад Савецкага Саюза ў выпадку вайны з фашысцкімі дзяржавамі. Для дасягнення гэтай мэты, як ён гаварыў, падкрэслівалася неабходнасць устанаўлення цеснай сувязі з польскім генеральным штабам.

Вось чаму Рыкаў зусім справядліва тут сказаў, што беларуская арганізацыя правых была па сутнасці экспазітурай польскага генеральнага штаба.

Зусім відавочна, што задача падрыхтоўкі плацдарма для нападу на СССР і забеспячэння перамогі над СССР у выпадку гэтага нападу, гэта задача была пастаўлена нямецкай, польскай і іншымі разведкамі перад «права-трацкісцкім блокам», як перад прамой агентурай фашысцкіх разведак.

Мы памятаем, нарэшце, паказанні Крэсцінскага. Як мыш, злоўленая ў мышалоўку, ён прабаваў ужо тут на працэсе кідацца з боку ў бок, нашчупваючы магчымыя шляхі свайго выратавання, але гэта аказалася безнадзейным. Крэсцінскі прызнаў, што ўжо ў 1920—1921 гг. па ўказанню Троцкага, ён, Крэсцінскі, вёў перагаворы разам з іншымі трацкістамі з генералам Сектам і з германскім рэйхсверам. ён прадаваў за 250 тысяч залатых марак у год шпіёнскія весткі генеральнаму штабу Германіі і забяспечваў беспярашкодны допуск у прадзелы СССР германскіх ваенных разведчыкаў.

Аб чым ішла тады гутарка, як не аб пераўтварэнні СССР у калонію германскага фашызма? У чым сутнасць гэтага пагаднення з рэйхсверам, ніці якога цягнуцца да здрады і прадажніцтва так называемага «права-трацкісцкага блока», — аб гэтым сказаў сам Крэсцінскі. Дазвольце коратка напомніць.

«Мы атрымліваем,—гаворыць ён,— невялікую суму грошай, а яны атрымліваюць шпіёнскую інфармацыю, якая ім будзе неабходна пры ваенным нападзе. Але-ж германскаму ўраду, — павучае далей Крэсцінскі, раскрываючы свае карты, — у прыватнасці Гітлеру, патрэбны калоніі, тэрыторыі, а не толькі шпіёнская інфармацыя і ён (г. зн. Гітлер) гатоў замест калоній, з-за якіх трэба біцца з Англіяй, Амерыкай і Францыяй, задаволіцца тэрыторыяй Савецкага Саюза». Пытанне стаіць, што называецца, ясна да прадзела. Карты, хоць і крапленыя карты, раскрыты поўнасцю. Яны гаварылі: «Мы вам даем не толькі шпіёнскія весткі, але ў патрэбную мінуту мы вам адкрыем фронт. За гэта плаціце нам грошыкі, на якія мы будзем весці сваю злачынную, падпольную трацкісцкую работу. Навошта вам біцца з Англіяй, Амерыкай і Францыяй з-за калоній? Вы можаце пераўтварыць СССР у сваю калонію. Па крайняй меры яе квітнеючыя ўкраінныя рэспублікі, напрыклад Украіну. Навошта вам біцца з Амерыкай, Англіяй і Францыяй з-за калоній, калі мы, вашы пакорныя слугі, гатовы вам аддаць савецкую зямлю за тыя залатыя маркі, якімі вы дапаможаце нам весці сваю падпольную работу».

Вось сэнс гэтага пагаднення.

«Права-трацкісцкі блок» — гэта не толькі безыдэйная, беспрынцыпная банда шкоднікаў, дыверсантаў, забойцаў, шпіёнаў — гэта чысцейшая банда агентаў замежных разведак у сапраўдным сэнсе гэтага самага слова. Яна адкрывае вароты ворагу, які страляе з патаенных акон па вуліцах, дапамагаючы ўторгнуўшамуся ў гарады і сёлы непрыяцелю, садзейнічае паражэнню сваёй радзімы.

Крэсцінскі гаварыў: «Мы ішлі на аднаўленне капіталістычных адносін у СССР і тэрытарыяльныя ўступкі буржуазным дзяржавам, з якімі аб гэтым ужо дагаварыліся».

У гэтым, па сутнасці кажучы, і ёсць увесь сэнс злачыннай дзейнасці блока.

Ад Крэсцінскага ў цынізме сваіх паказанняў не адстае і Грынько. Грынько-ж прама паказваў, што задача, пастаўленая іх замежна-разведчымі гаспадарамі, заключаецца, галоўным чынам, у тым, каб дапамагчы замежным агрэсарам. Гэта была, гаварыў Грынько тут, агульная пазіцыя і трацкістаў, і правых, і буржуазна-нацыяналістычных арганізацый, і, у прыватнасці, украінскай нацыянал-фашысцкай арганізацыі.

Гэта азначала падрыў абароннай магутнасці Савецкага Саюза, падрыўную работу ў арміі і абароннай прамысловасці, адкрыццё фронта ў выпадку вайны і правакацыю гэтай вайны.

Няма чаго казаць, ганаровыя задачы!

Самы пералік гэтых злачынных мэтаў з галавой выдае гэты блок, як чысцейшую банду шпіёнска-разведчых арганізацый некаторых замежных дзяржаў.

Ікрамаў тут нам расказаў аб тым, як важакі «права - трацкісцкага блока», і ў першую чаргу Бухарын, угаварвалі яго прыняць усе меры к таму, каб ператварыцца ў сапраўдную агентуру замежных разведак.

Маскоўскія важакі «права - трацкісцкага блока» інфармавалі Ікрамава аб японa-германскай, як яны гаварылі, «арыентацыі», аб сувязі з немцамі і японцамі. У імя чаго? У імя той-жа задачы, якая так выпукла была паказана і Грынько, і Крэсцінскім.

Я напомню вам допыт падсуднага Рыкава. На пытанне аб тым, што прадстаўляла сабой буржуазна - фашысцкая арганізацыя, якая дзейнічала ў Беларусі пад кіраўніцтвам Галадзеда, Чарвякова і Шаранговіча, Рыкаў павінен быў прызнаць, што навет назначэнне колькі-небудзь буйнае асобных работнікаў на кіруючыя пасты ў Беларусі папярэдне ўзгаднялася з польскай разведкай.

Я напомню вам паказанні падсуднага Іванова, які тут ужо гаварыў аб тым, што часам удзельнікі блока не адрознівалі, дзе дзейнічаюць правыя, а дзе дзейнічае замежная разведка, да такой ступені ўсё ў іх пераплялося.

Іваноў паказаў, што Бухарын рэкамендаваў яму паставіць справу такім чынам, каб паказаць англійскай буржуазіі, што правыя ахвотна ідуць на задавальненне ўсякага роду эканамічных і фінансавых інтарэсаў гэтай буржуазіі, рэкамендаваў выдаваць авансы англійскай буржуазіі з тым, каб, з аднаго боку, не страціць падтрымання для сябе, а з другога — не страціць давер'я.

Аб гэтым-жа гаварыў, па сутнасці, і Ракоўскі, калі ён паказваў, якое часта стваралася супярэчлівае становішча для «добрасумленных» агентаў замежных разведак, якім выглядаіць гэты чуллівы старычок, што сядзіць тут перад вамі на лаве падсудных. Сам Ракоўскі прадстаўляе такога спецыяліста, які служыў адначасова і японскай, і англійскай разведкам і папаў разам з Юрэневым у «цяжкае» для іх становішча.

«Мы, — гаварыў тут Ракоўскі, перадаючы словы Юрэнева, — апынуліся ў такім пераплёце, што часам не ведаеш, як сябе трымаць. Баішся, — як-бы задаволіць аднаго з нашых контрагентаў, не пакрыўдзіць другога. Вось цяпер, напрыклад, узнікае антаганізм паміж Англіяй і Японіяй у кітайскім пытанні, а нам прыходзіцца мець сувязь і з англійскай, і з японскай разведкамі...»

Цяжкае становішча для разведчыка! Цяжкае становішча для англійскага і японскага шпіёна.

У гэтай сувязі трэба сказаць пра Бухарына, які хацеў тут паказаць, што, па сутнасці гаворачы, ён не за паражэнне СССР, і не за шпіянаж, і не за шкодніцтва, і не за дыверсію, бо і наогул ён да гэтай практычнай справы мець адносіны не павінен, бо ён «тэарэтык», які займаўся праблематыкай усеагульных пытанняў.

Калі Бухарыну задаюць аб гэтым пытанне: «Інакш кажучы, была арыентацыя на дапамогу некаторых замежных дзяржаў?» ён адказваў: «Так, гэта можна і так сказаць». Ён не хоча прама сказаць, а гаворыць, што «гэта можна і так сказаць». Можна і трэба так сказаць, бо гэта адпавядае са праўдзнасці. На пытанне: «Інакш кажучы, арыентацыя на паражэнне СССР?», — Бухарын гаворыць, астаючыся верным сваёй туманнай славеснай эквілібрыстыцы: «Наогул, сумарна, паўтараю так».

Даволі іграць словамі! Даволі эквілібрыстыкі, «філасофіі»! Гутарка ішла аб дзяржаўнай здрадзе, аб пераходзе на бок ворага, аб адкрыцці фронта, аб паражэнні СССР, аб разгроме нашай бацькаўшчыны.

Уся шпіёнская работа асобных саўдзельнікаў гэтай змовы на ўсіх участках у цэлым накіроўвалася Бухарыным і Рыкавым. Усе шпіёнскія весткі ішлі ў адпаведныя органы па каналах пры дапамозе сродкаў і сувязей, якія былі ў руках Рыкава, Бухарына, Ягоды і іх саўдзельнікаў.

Тут на судзе раскрылася ў поўнай меры сувязь Рыкава, Бухарына і Ягоды з разведкамі раду замежных дзяржаў. Разам з меншавікамі, з Данам, з II Інтэрнацыяналам, з эсэрамі, з Масловым, з загранічнымі замежнымі разведкамі, разам з агрэсарамі яны прабавалі звергнуць савецкую ўладу і аднавіць уладу сапраўднага, мацёрага стопрацэнтнага капіталізма, сапраўднага панавання памешчыкаў і фабрыкантаў.

Аб сістэматычным абслугоўванні змоўшчыкамі з «права-трацкісцкага блока» замежных разведак мы маем даставерныя весткі.

Я прывяду тут вытрымку з такійскай газеты «Міако» ад 20 лютага 1937 г., якая змяшчае ў сябе інфармацыю аб сакрэтным пасяджэнні так называемай планава-бюджэтнай камісіі. Дэпутат Іосіда звярнуўся з запытаннем да ваеннага міністра генерала Сугіяма: «Ці вядома яму і арміі правозаздольнасць Сібірскай чыгункі». Міністр адказаў на гэта пытанне станоўча і сказаў, што правозаздольнасць Сібірскай чыгункі ім вядома, што яны маюць сістэматычныя весткі аб прапускной здольнасці Сібірскай чыгункі ад маючыхся ў Расіі элементаў, якія знаходзяцца ў апазіцыі да цяперашняга савецкага ўрада. Праз іх у Японіі атрымліваюць весткі аб Сібірскай чыгунцы.

Вось яны, гэтыя элементы, вось яны, гэтыя лазутчыкі, разведчыкі, слугі імперыялізма, гандлюючыя інтарэсамі нашай краіны. Вось яны — агенты ваеннага міністра, якія збіраюць свае сілы на рубяжах нашай радзімы для нападу на нашы свяшчэнныя граніцы.

Бухарын, Томскі, Рыкаў, Ягода збіраліся адкрыць фронт, але і тут, як і ўсюды, як і ва ўсёй сваёй здрадніцкай рабоце, яны дзейнічалі як правакатары. І гэта таксама не выпадкова, бо гэта характарызуе метад работы гэтых паноў. Яны рыхтуюцца адкрыць фронт, але яны хочуць так паказаць справу перад рабочымі і сялянамі ўсёй нашай краіны, перад усім нашым народам, што фронт адкрылі не яны, а хтосьці іншы, што яны, наадварот, супроць адкрыцця фронта, супроць здрады; яны навет згаварваліся аб тым, як гэтых, хто адкрые фронт, па іх уласнаму загаду, аддаць пад суд, каб сыграць, як цынічна выразіўся Бухарын, на патрыятычных лозунгах.

Ігра выкрыта. Здрадніцкія маскі з іх твараў сарваны і сарваны раз і назаўсёды. Ні адзін з падсудных не пасмеў адмаўляць сваёй злачыннай работы ў напрамку падрыхтоўкі паражэння СССР і расчлянення СССР.

Троцкі, як гэта было ўстаноўлена на папярэдніх працэсах, як гэта зноў пацверджана на даным працэсе, дагаварыўся з германскай і японскай разведкамі аб сумеснай барацьбе супроць СССР і савецкай улады. Мы і на гэтым працэсе маем па гэтаму повадзу вельмі падрабязныя паказанні аднаго з абвінавачваемых, іменна абвінавачваемага Бессонава.

Мы ведаем, што трацкісты змаглі пад сваёй маскай двурушніцтва пралезці на цэлы рад дастаткова адказных пастоў, на якіх практычна ажыццяўляецца наша замежная палітыка. Ракоўскія, крэсцінскія, юрэневы і іншыя, бессонавы і ім падобныя — гэта-ж усё людзі, якія выконвалі даручаную ім справу дыпламатычнага прадстаўніцтва СССР у знешніх зносінах. Гэтым, між іншым, яшчэ больш усугубляецца іх віна і цяжар іх адказнасці перад савецкай дзяржавай і савецкім народам.

Гэтыя паны скарысталі сваё службовае становішча, — і так рабіў і Ракоўскі, і Грынько, і Крэсцінскі, — для таго, каб сарваць справу міру, для таго, каб прыняць усе меры правакацыі магчымых сутычак ва ўгоду імперыялістам.

Другі пункт пагаднення — усебаковае супрацоўніцтва трацкісцкіх арганізацый у СССР з германскімі падпольнымі і шпіёнскімі арганізацыямі і іх агентамі. Для чаго? Для падрыву ваеннай і гаспадарчай магутнасці СССР, для паскарэння паражэння СССР у вайне.

Трэці пункт — садзейнасць германскага фашызма дзяржаўнаму перавароту ў СССР у мэтах пераходу ўлады ў рукі «права-трацкісцкага блока».

Чацверты — паскарэнне інтэрвенцыі і неадкладнае заключэнне міру з новым урадам пасля яго прыходу да ўлады — натуральны крок у плане той здрадніцкай работы, якую вялі гэтыя паны.

Пяты — адрыў Украіны ад СССР у карысць Германіі, як адрыў Прымор'я ў карысць Японіі, як і адрыў Беларусі ў карысць Польшчы, як расчляненне ўсяго нашага Савецкага Саюза шляхам адрыву асобных абласцей і рэспублік і аддача іх у распараджэнне замежных імперыялістаў.

Бухарын павінен быў тут прызнаць, што ўмовы, на якіх быў заключан гэты так называемы саюз, — а гэта зусім не «саюз» (а гэта ёсць, па сутнасці кажучы, гаспадарска-прыказчыцкі дагавор)—гэтымі ўмовамі былі: расчляненне СССР, адрыў ад СССР Украіны, Прымор'я, Беларусі. Я запытаў Бухарына: «У карысць каго?» І ён адказаў: «У карысць Германіі, у карысць Японіі, часткова Англіі». Гэта ўласнае прызнанне Бухарына, ад якога яму няма куды ўйсці і ад якога ён не ўйдзе.

Трацкісты і правыя дзейнічалі іменна ў адпаведнасці з гэтым пагадненнем.

У антысавецкім «права-трацкісцкім блоку» віднае месца займалі буржуазна-нацыяналістычныя групы, якія ўтварыліся ў некаторых нацыянальных рэспубліках пад прамым уплывам агентуры тых-жа замежных разведак і пад непасрэдным кіраўніцтвам так званага цэнтра «права-трацкісцкага блоку».

Здраднікі Грынько, Хаджаеў, Шаранговіч, Ікрамаў — гэта пражжоныя, мацёрыя контррэвалюцыянеры розных масцей, з вялікім контррэвалюцыйным стажам, ад барацьбістаў, ад «Міллі Істыклял» і «Міллі Ітыхад» да «права-трацкісцкага блока».

Рыкаў запэўняў Хаджаева, што пад кіраўніцтвам правых Узбекская нацыяналістычная арганізацыя можа дабіцца «незалежнасці» Узбекскай рэспублікі.

Разам з Рыкавым у гэтым-жа напрамку дзейнічаў і Бухарын, які ўсхваляў, па словах Хаджаева, германскі фашызм, гаварыў, што фашысцкая Германія зараз усімі сіламі працуе над тым, каб зрабіць Германію гегемонам Еўропы і што магчыма пагадненне паміж Японіяй і Германіяй для барацьбы з СССР.

Права - трацкісцкія і буржуазна-нацыяналістычныя здраднікі, ва ўгоду сваім капіталістычным гаспадарам, хацелі вярнуць пад капіталістычнае ярмо вызваленыя вялікай соцыялістычнай рэвалюцыяй, раней прыгнятаўшыяся царызмам, памешчыкамі і капіталістамі — народы нашых брацкіх саюзных рэспублік. Не смеючы адкрыта сказаць аб сваіх здрадніцкіх планах паднявлення народаў, паднятых на велізарнейшую вышыню ў рэзультаце ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, на вышыню культурна - палітычнага і эканамічнага росквіту, — гэтыя здраднікі практыкавалі свае здрадніцкія, хлуслівыя, ашуканчыя лозунгі і прамовы аб незалежнасці гэтых рэспублік.

Быццам ёсць іншая краіна ў свеце, апрача СССР, дзе была-б сапраўды забяспечана сапраўдная незалежнасць, сапраўдная і поўная нацыянальная культура, сапраўдны росквіт мільённых мас народаў. Такой краіны, апрача СССР, няма ва ўсім свеце! У той час, як у калоніях капіталістычных краін — у Індыі, Алжыры, Тунісе, Марокко, як і ва ўсходніх краінах, народы томяцца пад цяжкім ярмом капіталістычнага гнёту, дзе ўсё больш прагрэсіруе беднасць і жабрацтва, выміранне мас ад голаду, дзе квітнее сіфіліс, туберкулёз, дзе ўсё больш і больш квітнеюць разарэнне і паўперызацыя, — у СССР, у яе слаўных адзінаццаці саюзных рэспублік усё больш і больш расце матэрыяльны дабрабыт мас, усё вышэй і вышэй узнімаецца нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу культура, усё радасней і ярчэй зззяе вялікімі благаславеннымі праменнямі заззяўшае над багатымі, неабсяжнымі прасторамі гэтых рэспублік новае соцыялістычнае сонца, сонца неўвядаемай славы брацкага непарушнага саюза народаў — Саюза Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Шкоднікі, дыверсанты

Гэта шайка здраднікаў дзейнічала ўжо вядомымі, не раз ускрытымі судом, злачыннымі метадамі: метадам шкодніцтва, дыверсіі, шпіянажа, тэрору. Шкоднікі, дыверсанты, шпіёны пралезлі ў рад галін і занялі там кіруючае становішча. Так было з Чэрновым, займаўшым высокі пост народнага камісара земляробства Саюза, так было з Грынько, займаўшым высокі пост народнага камісара фінансаў СССР, так было з Розенгольцам, займаўшым высокі пост народнага камісара знешняга гандлю СССР, так было з Зеленскім, былым старшынёй Цэнтрасаюза, так было яшчэ ў радзе іншых выпадкаў. У руках гэтых злачынцаў былі, вядома, такія магчымасці самага шырокага і ў той-жа час самага замаскаванага і самага небяспечнага шкодніцтва, якія рэдка бываюць у руках злачынцаў.

Праследуючы сваю асноўную мэту— звяржэнне савецкай улады, «права-трацкісцкі блок», — як гэта паказала наша судовае следства, — не спыніўся перад самымі бруднымі і самымі цынічнымі метадамі, каб падарваць давер'е мас да органаў савецкай улады, каб пасеяць сярод насельніцтва нездаволенне советамі і ўзняць, па магчымасці, народ супроць савецкай улады.

Гэта правакацыйная дзейнасць, правадзімая кожным з абвінавачваемых там, дзе ён працаваў, прадстаўляе сабой велізарнейшую агульна-палітычную небяспеку.

Аб гэтым асабліва сведчаць такія справы, як, напрыклад, упамінаўшаяся тут на судзе лепельская справа: бясчынствы і беззаконні, якія ажыццяўляліся па ўказцы гэтага блока змоўшчыкамі і злачынцамі, былі накіраваны к таму, каб практыкай беззаконных дзеянняў дыскрэдытаваць у вачах найшырэйшых мас насельніцтва савецкую ўладу.

Вазьміце фінансы. Асноўнай устаноўкай шкоднікаў у галіне фінансаў, — як гэта сфармуляваў Рыкаў, са згоды Бухарына, — было «ўдарыць па савецкаму ўраду савецкім рублём». Гэта перафразіроўка старога трацкісцкага лозунга, які вядом па іншых працэсах праз Пятакова — «біць найбольш адчувальнымі сродкамі па найбольш адчувальных месцах».

У асобе Грынько мы бачым старога закаранелага ворага савецкай улады, які цалкам і поўнасцю прадаўся нямецкай разведцы, актыўна змагаўся шляхам шкодніцтва, дыверсій, здрады і тэрора супроць савецкай улады, за рэстаўрацыю капіталізма.

Вазьміце другога разведчыка Чэрнова, несумненна, «таленавітага» чалавека, бо ён паспеў пабываць за адзін толькі вечар у Дана з Кібрыкам, пабіцца з паліцэйскімі, папасці ў паліцэйпрэзідыум і зрабіцца нямецкім разведчыкам.

Нічога тут непраўдападобнага, аднак, няма. Так у жыцці як раз і бывае з такімі людзьмі, як Чэрноў. Гэта цяпер у яго выгляд больш ці менш свежы і здаровы. Зняволенне яму ў значнай ступені дапамагло. На волі ў яго быў іншы твар — спіты твар алкаголіка, які больш піў, чым працаваў. Гэта быў чалавек, хворы спецыяльным недугам — алкагалізмам. І вось, па даручэнню ўрада, ён паехаў за граніцу. Але адначасова бярэ на сябе даручэнне «блока», які карыстаецца яго выпадковай камандыроўкай для таго, каб накіраваць яго для арганізацыі сувязі з Данам. Пападае ён да Дана і Кібрыка. Дан і Кібрык — гэта ясна — нямецкія разведчыкі. Гэта відаць хоць-бы з таго, што той разгавор, які ён вёў з Данам і Кібрыкам, стаў тут-жа вядомы разведцы паліцэйпрэзідыума. Паехаў ён па даручэнню ўрада, а аказаўся звязаным з такімі мацёрымі меншавікамі,

(Працяг прамовы на 4-й стар.)

ПРАЦЯГ ПРАМОВЫ тав. А. Я. ВЫШЫНСКАГА

як Дан і Кібрык, з імі ён вядзе шашні. Гэта можа каштаваць Чэрнову не толькі палітычнай кар'еры. І на гэтым іграе нямецкая разведка. Па поваду Чэрнова нават Рыкаў састрыў, што Чэрноў у адзін вечар паспеў пабываць у паліцэйпрэзідыуме і папасці ў разведчыкі.

І вось Чэрноў дзейнічае па заданню нямецкай разведкі, і прама гаворыць: «Асобай умовай нямецкая разведка ставіла арганізацыю шкодніцтва ў галіне конегадоўлі». З тым, каб, як гаварыў Райвід, не даць коней для Чырвонай Арміі.

Розенгольц таксама дзейнічае так, як гэта цікавіць немцаў і японцаў. Ен заключае спецыяльна ў інтарэсах гэтых замежных дзяржаў нафтавы дагавор. Ен спецыяльна па-шкодніцку арганізоўвае экспарт золатаадыходаў у інтарэсах тых-жа дзяржаў, у прамое парушэнне інтарэсаў сваёй бацькаўшчыны. Ен арганізоўвае шкодніцкі і злачынны экспарт у Японію чыгуна, каб гэты чыгун пайшоў як раз на тыя снарады, якімі збіраецца японская ваеншчына калі не бамбардыраваць, то ва ўсякім выпадку, палохаць нашу бацькаўшчыну. Ен усімі сродкамі затрымлівае абаронны імпарт. Ен дзейнічае так, як яму загадала разведка, скарыстоўваючы сваё высокае становішча, ашукваючы, прадажніцка-вераломна здраджваючы свайму дзяржаўнаму доўгу.

Ікрамаў разам з Хаджаевым не адстаюць у шкодніцтве ад сваіх цэнтральных «калег». Ен сам паказваў тут аб шкодніцтве ў Намангане, аб шкодніцтве на шоўкаматальных фабрыках, на бавоўнаачышчальных заводах, аб шкодніцтве ў арганізацыі бавоўнянай гаспадаркі. Па іх паказаннях у арганізацыі гэтай шкодніцкай падрыўной работы роля Рыкава і Бухарына была зусім выразнай — роля, якую можна назваць кіруючай.

Зеленскі. Тут я толькі ўкажу на гэту ганебнейшую практыку падкідвання ў прадметы харчавання шкла і цвікоў, у прыватнасці ў масла, што біла па самых вострых жыццёвых інтарэсах, інтарэсах здароўя і жыцця нашага насельніцтва. Шкло і цвікі ў масле! Гэта-ж такое страшэннае злачынства, перад якім, мне здаецца, бляднеюць усе астатнія падобнага роду злачынствы. У нашай краіне, багатай усялякімі рэсурсамі, не магло і не можа быць такога становішча, калі які-б та ні было прадукт аказваўся ў недахваце. Імення таму задачай усёй гэтай шкодніцкай арганізацыі было — дабіцца такога становішча, каб тое, што ў нас ёсць удосталь, зрабіць дэфіцытным, трымаць рынак і патрэбы насельніцтва ў напружаным стане. Напомню тут толькі эпізод з дзейнасці Зеленскага — гісторыю з 50 вагонамі яек, якія Зеленскі знішчыў свядома для таго, каб Маскву пакінуць без гэтага неабходнейшага прадукта харчавання.

Арганізуючы шкодніцтва, усе гэтыя рыкавы і бухарыны, ягоды і грынько, розенгольцы і чэрновы і т. д. і т. п. праследвалі ў гэтай галіне пэўную мэту — папрабаваць задушыць соцыялістычную рэволюцыю кастлявай рукой голаду. Не ўдалося і ніколі не ўдасца!

Шаранговіч разводзіць анемію коней — падае 30 тысяч коней. Шаранговіч падрывае тарфяную прамысловасць. Шаранговіч свядома сее нацыянальную рознь, развіваючы нацыяналістычныя пачуцці сярод беларускага насельніцтва.

Іваноў разбурае заводы, разбурае цэлюлозна-папяровую прамысловасць, хоць і з асцярожнасцю, з аглядкай, як бы занадта не пашкодзіць інтарэсам англійскіх гаспадароў, якім «права-трацкісцкі блок» хацеў перадаць лясную гаспадарку і на якіх працаваў у меру сіл сваіх і магчымасцей.

І да гэтага дадаецца арганізацыя прамых і адкрытых узброеных выступленняў супроць совецкай улады. Бухарын пасылае разам з Рыкавым Слепкова на Паўночны Каўказ, Якавенка — у Сібір, якія і выклікаюць там паўстанцкі рух, звязваюцца з казацкімі белагвардзейскімі коламі заграніцай, рыхтуюць казацкі дэсант на Паўночным Каўказе. Рыкаў з Зубарэвым арганізоўваюць на Урале паўстанцкія атрады. Ікрамаў з Хаджаевым арганізоўваюць паўстанцкія атрады пад кіраўніцтвам тых-жа Бухарына, Рыкава і іншых у Сярэдняй Азіі з мул, баеў, усякага роду дэкласаваных элементаў. Нават Іваноў у Паўночным краі і той працуе над арганізацыяй паўстанцкіх атрадаў, па прамому даручэнню Бухарына, з высланых кулакоў, — відавочна, такім чынам Бухарын і хацеў забяспечыць кулакам магчымасць «урастання ў соцыялізм».

Забойства дзеячоў совецкай дзяржавы С. М. КІРАВА, В. Р. МЕНЖЫНСКАГА, В. В. КУЙБЫШЭВА, А. М. ГОРКАГА

Я пераходжу цяпер да наступнага раздзела, а імення—да тэрарыстычнай дзейнасці абвінавачваемых і да задуманых і ажыццёўленых імі забойстваў дзеячоў совецкай дзяржавы: забойстваў С. М. Кірава, В. Р. Менжынскага, В. В. Куйбышэва, А. М. Горкага і да забойства М. А. Пешкова.

Гэта адзін з найбольш чорных і найбольш цяжкіх момантаў працэса.

Як Рыкаў матываваў пераход сваёй падпольнай групы да тэрора? Вельмі адкрыта. Ен гаварыў: «Пры нелегальным змоўшчыцкім характары контррэволюцыйнай арганізацыі правых, пры адсутнасці якой-небудзь масавай базы для яе контррэволюцыйнай работы, пры адсутнасці надзеі якім-небудзь іншым шляхам прысці да ўлады прыняцце тэрора давала, па думцы цэнтра, якуюсьці перспектыву».

Смяротным холадам і смуродам вее ад гэтых паказанняў Рыкава і іншых права-трацкісцкіх фашысцкіх змоўшчыкаў.

Бухарын таксама стаяў за тэрор, хоць, як ён заяўляў, арыентаваўся хутчэй не на тэрор, а на масавыя паўстанні. Ну, як ён там арыентаваўся, гэта яго справа тлумачыць, але мы ведаем, што ён вельмі даўно, — зараз гэта трэба лічыць поўнасцю даказаным, — прымаў удзел яшчэ ў 1918 годзе ў арганізацыі тэрарыстычных актаў і Каплан, і «левых» эсэраў, і трацкістаў, і правых эсэраў. Ен сам гаворыць поўным голасам аб тым, што затым у 1932 годзе ён вядзе перагаворы з былым эсэрам Семёнавым, арганізатарам тэрарыстычных актаў і кіраўніком баявых эсэраўскіх дружын, вядзе перагаворы аб арганізацыі тэрарыстычнай барацьбы супроць таварыша Сталіна і таварыша Кагановіча. У 1932 годзе Бухарын праз Пятакова і Седова вядзе перагаворы аб той умове, дырэктыве або, як ён называе, устаноўцы Троцкага, якая заключалася ў неабходнасці перайсці да тэрора. Змоўшчыцкі блок шырока разгортвае арганізацыю тэрарыстычных груп, якія практычна падрыхтоўваюць учыненне тэрарыстычных актаў, забойства Кірава. Гэта забойства было поўнасцю раскрыта і выкрыта на папярэднім працэсе, але толькі цяпер устаноўлена, што дзейнасць трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра, забіўшага Сергея Міронавіча Кірава, не насіла самастойнага характару. Цяпер устаноўлена, што Кіраў быў забіт па пастанове вось гэтага імення права-трацкісцкага цэнтра, вось гэтага блока, які можна назваць цэнтрам усіх цэнтраў.

Абвінавачваемы Ягода пацвердзіў на судзе, што забойства Кірава зроблена па прамому рашэнню «права-трацкісцкага блока», што гэта рашэнне ажыццёўлена было Ягодай, на якога і быў ускладзен гэты ганебны абавязак.

Ягода пацвердзіў на судзе, што Рыкаў і Бухарын удзельнічалі ў прыняцці гэтага рашэння; што Рыкаў і Енукідзе ўдзельнічалі на пасяджэнні цэнтра, дзе абмяркоўвалася пытанне аб забойстве С. М. Кірава; што Рыкаў і Енукідзе прымалі, такім чынам, непасрэдны ўдзел у абмеркаванні самога пытання аб забойстве Сергея Міронавіча Кірава. На маё прамое пытанне, ці праўду тут гавораць Бухарын і Рыкаў, заяўляючы, што яны не ведалі аб гэтым забойстве, Ягода заявіў, што гэтага быць не можа, бо калі Енукідзе перадаваў аб тым, што «права-трацкісцкі блок» на сумесным пасяджэнні рашыў пытанне аб учыненні тэрарыстычнага акта над Кіравым, — ён, Ягода, адмаўляўся ад гэтага па некаторых «тактычных» канспіратыўных меркаваннях, але ўсё-ж быў асвядомлен, што гэта — рашэнне іх цэнтра, а не выступленне якойсьці партызанскай кучкі змоўшчыкаў, што гэта рашэнне выходзіла ад «права-трацкісцкага блока», у якім актыўны ўдзел прымалі і Бухарын, і Рыкаў.

Зараз у дакладнасці ўстаноўлена, што забойства таварыша Кірава было зроблена пры бліжэйшым удзеле Ягоды. Я лічу даказаным і тое, што забойства было зроблена пры бліжэйшым удзеле Рыкава і Бухарына.

Але забойствам Кірава не абмяжоўваецца, як гэта ўстаноўлена судовым следствам, тэрарыстычная дзейнасць права-трацкісцкіх здраднікаў і змоўшчыкаў.

Як устаноўлена следствам, Алексей Максімавіч Горкі, Вячаслаў Рудольфавіч Менжынскі і Валерыян Владзіміравіч Куйбышэў палі афярамі тэрарыстычных актаў, ажыццёўленых па заданню гэтага-ж «права-трацкісцкага блока». Паў афярай забойства і сын А. М. Горкага — М. Пешкоў.

Ягода па гэтаму пытанню даў такія паказанні:

«Я катэгарычна заяўляю, што забойства Кірава было праведзена па рашэнню цэнтра «права-трацкісцкага блока». Па рашэнню гэтага-ж цэнтра былі праведзены тэрарыстычныя акты і ўмярцвлёны Куйбышаў, Менжынскі і Горкі».

Гэта-ж пацвярдзілі і тыя асобы, якія непасрэдна прымалі ўдзел у гэтым забойстве. Подлы замысел шэфа забойцаў — Ягоды быў ажыццёўлен самым вераломным, подлым і езуіцкім спосабам.

Ен гаворыць, што па гэтаму пытанню было спецыяльнае рашэнне цэнтра, перададзенае яму Енукідзе. Тут было прадугледжана выкарыстанне ўрачоў, што ствараць поўную гарантыю ў сэнсе немагчымасці выкрыцця.

Як мы бачым, Ягода — не просты забойца. Гэта — забойца з гарантыяй на невыкрыццё. Яго меркаванні, аднак, і тут не апраўдаліся. Гарантыя аказалася гнілой, яна правалілася. Ягода і яго подлая злачынная дзейнасць выкрыты, выкрыты не той здрадніцкай разведкай, якую арганізаваў і якую накіроўваў супроць інтарэсаў совецкай дзяржавы і нашай рэволюцыі здраднік Ягода, а выкрыты той сапраўднай, сапраўды большэвіцкай разведкай, якой кіруе адзін з выдатнейшых сталінскіх спадвіжнікаў—Нікалай Іванавіч Ежоў.

Енукідзе і Ягода гутараць на тэму, як лепш з пункту погляду тых гарантый, якія шукаў Ягода, адправіць на той свет Менжынскага і выбраныя ім іншыя афяры. Ягода высоўвае сваю хітравумную думку: дабіцца смерці, як ён гаворыць, ад хваробы, або як ён тут на судзе сказаў: «я прызнаю сябе віноўным у захворванні Максіма Пешкова».

Ягода стаяў на вышыні тэхнікі ўмярцвення людзей самымі каварнымі спосабамі. Ен прадстаўляў сабою апошняе слова бандыцкай «навукі», пера крыўшы цэлы рад іншых злачынцаў, якія не разумелі гэтых далёка і глыбока ідучых злачынных замыслаў Ягоды.

«Калі Енукідзе перадаваў рашэнне кантактнага цэнтра аб забойстве Кірава, я выразіў апасенне, — гаварыў Ягода, — што прамы тэрарыстычны акт можа праваліць не толькі мяне, але і ўсю арганізацыю. Я ўказваў Енукідзе на менш небяспечны спосаб і напомніў яму, Енукідзе аб тым, як пры дапамозе урачоў быў умярцвён Менжынскі. Енукідзе адказаў, што забойства Кірава павінна ўчыніцца так, як намечана, і што забойства гэта ўзялі на сябе трацкісты і зіноўеўцы, а наша справа — не перашкаджаць.

Ягода далей гаварыў:

«Праз некаторы час, пры наступнай сустрэчы маёй з Енукідзе, ён паведаміў мне, што цэнтр прыняў рашэнне прыступіць да раду тэрарыстычных актаў над членамі Палітбюро і, апрача таго, персанальна над Максімам Горкім. Енукідзе мне растлумачыў, што «права-трацкісцкі блок», маючы на ўвазе, як бліжэйшую перспектыву зважэнне совецкай улады, бачыць у асобе Горкага небяспечную фігуру. Горкі — непахісны прыхільнік сталінскага кіраўніцтва, і, несумненна, у выпадку рэалізацыі змовы, узніме голас пратэсту супроць нас, змоўшчыкаў».

Вось чаму было пастаўлена пытанне. вырашанае канчаткова гэтым блокам, аб умярцвенні Алексея Максімавіча Горкага.

Яшчэ адно рашэнне аб устраненні пала на Валерыяна Владзіміравіча Куйбышэва, як на аднаго з актыўных членаў ленінска - сталінскага Палітбюро.

Такім чынам, за гэты кароткі тэрмін тры афяры, тры заўчасна загінуўшых выдатных чалавекі сышлі ў магілу па рашэнню «права - трацкісцкага блока». Трое лепшых людзей нашай краіны, адданыя сыны сваёй радзімы, палі афярай бессаромнай змовы здраднікаў. І сярод іх — гордасць рускай і сусветнай літаратуры — вялікі рускі пісьменнік, геніяльны мастак Алексей Максімавіч Горкі.

Кожны радок яго песень і казак, аповесцей і раманаў дышыць благародствам, жарам рэволюцыйных дзеянняў. Недарма ён сваё жыццё звязаў з вялікім Леніным і вялікім Сталіным, як іх лепшы і бліжэйшы друг. Недарма Ленін не раз пісаў, што Горкі — велізарны мастацкі талент, які прынёс і прынясе шмат карысці сусветнаму пралетарскаму руху.

Ад здрадніцкіх удараў у хворае сэрца вялікага чалавека загінуў лепшы з прыяцеляў працоўнага чалавецтва, пагас адзін з самых яркіх і моцных свяцільнікаў чалавечага розуму і чалавечай прыгожасці. Гэты свяцільнік загасілі вось гэтыя здраднікі, вось гэтыя чалавекападобныя зверы, халоднакроўна і здрадніцкі навекі спыніўшыя гарачае і благароднае сэрца вялікага чалавека.

Цяпер усё раскрыта. Цяпер вядомы не толькі способы забойства, але іх матывы, і самыя забойцы. Бессонаў гаворыць, што калі ён у ліпені 1934 года бачыўся ў Парыжы з Троцкім, які заўсёды злобна ненавідзеў Горкага, як і Горкі ненавідзеў обер-бандыта міжнароднага шпіянажа і здрадніцтва Троцкага, тады Троцкі сказаў, што Горкага трэба ўстраніць ва што-б та ні стала, што Горкі шырока папулярны як бліжэйшы друг Сталіна, як правадвік генеральнай лініі партыі. Троцкі даў Бессонаву прамое даручэнне, якое загадаў перадаць Пятакову. Як гаворыць Бессонаў, даручэнне гэта было дана ў самай катэгарычнай форме: Горкага знішчыць фізічна ва што-б та ні стала. І гэты загад ворага народа і обер-бандыта Троцкага быў Бессонавым прывезен сюды, у СССР, і перадан Пятакову, перадан блоку, які, як гэта паказаў Ягода і як гэта я дакажу далей, прыняў гэта даручэнне, прыняў рашэнне аб забойстве А. М Горкага. Гэта так страшэнна, што на гэтым я лічу неабходным спыніцца асоба і спецыяльна.

Першае пытанне, якое я хацеў-бы тут паставіць, гэта пытанне аб тым, ці ўдзельнічалі ў гэтай справе Рыкаў і Бухарын, ці ведалі яны аб тым, што рыхтуецца гэта страшэннае зладзеянне. На гэта пытанне я адказваю без хістанняў і цвёрда: так, ведалі, так, удзельнічалі. Я не хачу аперыраваць ніякімі іншымі паказаннямі, і, у прыватнасці, паказаннямі Ягоды, — я буду аперыраваць: 1) паказаннямі саміх Рыкава і Бухарына і 2) тым, што я называю логікай рэчаў. Як абстаіць тут справа? Вы паглядзіце, што гаворыць па гэтаму поваду Рыкаў. Рыкаў паказаў, што ў яго, у Рыкава, мела месца размова з Енукідзе. гэта значыць з адным з актыўнейшых удзельнікаў і арганізатараў змоўніцкага блока. Наколькі ён быў актыўным у арганізацыі забойстваў, у нас ёсць паказанні Максімава-Дзікоўскага. Енукідзе не раз выклікаў яго да сябе і даваў указанні, як лепш забяспечыць смерць Валерыяна Владзіміравіча Куйбышэва. Енукідзе займаўся гэтай «справай» разам з Ягодай. Вось з гэтым Енукідзе Рыкаў вядзе размову — аб чым? Возьмем толькі тое, што сказаў сам Рыкаў: «мне Енукідзе паведаміў, што трацкісты і зіноўеўцы надзвычайна заклапочаны тым уплывам, які набывае Горкі, што ён з'яўляецца рашучым прыхільнікам Сталіна і генеральнай лініі партыі». Гэта тое-ж самае, што пачуў Бессонаў ад Троцкага ў 1934 годзе і што прывёз сюды восенню 1934 года і перадаў вярацілам, кіраўнікам, главарам гэтага блока.

Я лічу зусім даказанымі і ўстаноўленымі наступныя факты, з якіх выцякае толькі адзін вывад — вывад аб удзеле Рыкава ў падрыхтоўцы ўмярцвення А. М. Горкага. Па-першае, у 1935 годзе Енукідзе і Рыкаў гаварылі аб асобым азлабленні, якое адчувае блок да Алексея Максімавіча Горкага. Праўда, яны зварачваюць справу на трацкісцка-зіноўеўскую частку блока, аднак, гэта не мяняе ні ў якой меры справу. Па-другое, яны гэты злобны настрой выражалі ў такіх тонах, якія гаварылі аб падрыхтоўцы гвалтоўных мер, накіраваных да «ліквідацыі палітычнай актыўнасці» Горкага. І, па-трэцяе, ліквідацыя палітычнай актыўнасці Горкага мыслілася аж да прымянення да Горкага гвалтоўных мер.

Па-чацвертае, гэтыя гвалтоўныя меры ўключалі ў сябе і забойства Алексея Максімавіча Горкага. Аб гэтых гвалтоўных мерах Рыкаў і Бухарын ведалі. Яны ведалі, што рыхтуецца забойства Горкага, арганізоўвалі гэта забойства, пакрывалі гэта забойства. Рыкаў і Бухарын былі такім чынам удзельнікамі гэтага падлейшага забойства. А. М. Горкага.

Мы ведаем, як ставілася пытанне змоўшчыкамі аб барацьбе супроць совецкай улады. Іх метады—тэрор, здрада і т. д.

Бухарын гаворыць, што, калі гаварыць аб варожым акце, можна разумець усё, аж да тэрарыстычных актаў, амплітуда хістанняў тут вельмі вялікая. Бухарын прызнае, што забойства Горкага тады не было выключана. Гэта — завуаляванае прызнанне, якое выдае Бухарына з галавой.

Я ўжо гаварыў аб способах, пры дапамозе якіх былі ажыццёўлены тры тэрарыстычных акты — супроць Менжынскага, супроць Куйбышэва і супроць Алексея Максімавіча Горкага.

Звяртае на сябе ўвагу способ, пры дапамозе якога гэтыя забойствы зроблены. Гэта—способ паступовага ўмярцвення, «забойства з гарантыяй», аб якім гаварыў Ягода, — гэта способ забойства пры дапамозе скарыстання спецыяльных ведаў саўдзельнікаў. Не дрэнна задумана! Левін, Плетнёў і Казакоў, Максімаў-Дзікоўскі, Кручкоў, Буланаў — банда забойцаў, спецыяльна падрыхтаваная банда, удзельнічала ў гэтай «справе». Я хачу звярнуць вашу ўвагу на асаблівы способ і асаблівую ролю ў ажыццяўленні гэтага забойства, якую адыгралі абвінавачваемыя ўрачы — Левін, Казакоў і Плетнёў. Але папярэдне я хачу спыніцца на некалькіх заўвагах. Гісторыя і хроніка крымінальных забойстваў нам гаворыць, што за апошнія дзесяцігоддзі атручванні пры дапамозе прафесіянальных забойцаў амаль сышлі са сцэны.

Месца гэтых атрутнікаў занялі ўрачы. Калі вы раскрыеце падручнік судовай медыцыны доктара Карла Эмерта, прафесара Бернскага універсітэта, вы знойдзеце тут надзвычай павучальныя ўказанні. Эмерт піша: «Забойствы пры дапамозе атручвання сталі цяпер радзей, параўнальна з ранейшымі, часткова таму, што для не ўрача стала цяжэй здабыць яд. Таму прафесіянальных атрутнікаў больш не сустракаецца, як раней. Калі-ж і бываюць падобныя выпадкі, то яны часта адносяцца да асоб урачэбнага саслоўя».

Таму зусім не выпадкова, што Ягода выбірае для свайго страшэннага замыслу і яго рэалізацыі імення ўрачоў. Ен улічвае, так сказаць, гістарычную кан'юнктуру.

Я, нарэшце, павінен сказаць, што імення ў гэтым плане быў задуман злачынцамі-забойцамі тэрарыстычны акт супроць Нікалая Іванавіча Ежова. Бо гэта забойства таксама было задумана даволі тонка — пры дапамозе атручвання паветра, якім павінен быў дыхаць у сваім службовым кабінеце Нікалай Іванавіч Ежоў, атручванне паветра ртуццю, растворанай у кіслаце. Прычым Ягода папярэджваў — ні ў якім выпадку не ў сернай кіслаце, таму, што серная кіслата пакідае следі і можа спаліць тыя самыя шторы і гардзіны, якія трэба было па ўказанню Ягоды прапітаць для таго, каб, удыхаючы гэта паветра, мог загінуць Нікалай Іванавіч Ежоў.

Я хачу, таварышы суддзі, напомніць некалькі даных экспертызы па гэтаму пытанню, якія не пакідаюць ніякага сумнення ў тым, што гэты план вельмі тонкі, вераломны і подлы, задуманы Ягодай з ведама і адабрэння права-трацкісцкага цэнтра, у асаблівасці ў адносінах Куйбышэва, Горкага і Нікалая Іванавіча Ежова, якога яны хацелі ўстраніць для таго, каб астаецца нявыкрытымі.

Перш за ўсё я звяртаю вашу ўвагу на тое, што экспертыза была складзена з выдатных дзеячоў совецкай і сусветнай медыцынскай навукі. Я звяртаю вашу ўвагу, што гэта экспертыза прышла да аднадушнага заключэння: экспертыза пацвердзіла, што меры, прынятыя забойцамі ў адносінах умярцвення А. М. Горкага, В. В. Куйбышэва, Менжынскага, сапраўды былі строга прадуманымі і мелі сваім рэзультатам смерць гэтых выдатных людзей, да якой гэтыя паны імкнуліся.

Таму я дазволю сабе заявіць, што абвінавачванні, прад'яўленыя ў абвінаваўчым заключэнні і падтрымліваемыя мною, як дзяржаўным абвінаваўцам, і ў гэтай частцы ў поўным аб'ёме можна лічыць даказанымі.

Гаворачы аб гэтай частцы абвінавачвання, я хачу спыніцца спецыяльна на двух падсудных — на Ягодзе і Левіне.

Аб Ягодзе разгавор кароткі. Ягода—галоўны арганізатар і натхніцель гэтых страшэнных злачынстваў, яго адказнасць тым больш моцна і сур'ёзна, што Ягода — не проста Ягода, гэта быў у той час намеснік старшыні АДПУ, фактычна старшыня АДПУ. Гэта чалавек, на абавязку якога ляжала ахова дзяржаўнай безапаснасці. Калі-б тыя злачынствы, якія зрабіў Ягода, у якіх ён прызнаўся, калі-б ён зрабіў іх у мільённай дозе, то і тады я ўправе быў-бы трэбаваць ад суда расстрэлу Ягоды.

Левін адыграў у гэтых забойствах таксама віднейшую ролю. Левін быў галоўным арганізатарам задуманых Ягодай забойстваў, ім прыцягнуты да гэтай справы былі і Казакоў, і Плетнёў, ён, я сказаў-бы, у гэтай справе быў правай рукой Ягоды, як Буланаў быў правай рукой Ягоды ва ўсіх злачынствах апошняга ў цэлым.

Калі загінуў ад рукі Левіна Алексей Максімавіч Горкі, Левін, доктар медыцынскіх навук, апублікаваў у газетах некролаг — «Апошнія дні Алексея Максімавіча Горкага». У гэтым некролагу ён пісаў, уздыхаў, стагнаў аб гібелі вялікага чалавека. «Вялікія людзі, — пісаў ён фарысейска, двудушна, па-двурушніцку, — жывуць і паміраюць, як вялікія людзі». «Жывуць і паміраюць, як вялікія людзі!» Левін не дадаў, — «ад рукі аўтара гэтага некролага, аднаго з подлых забойцаў!»

Ганебнае двурушніцтва, вераломства, двудушнасць тут супернічаюць з бессаромнасцю атрутніка, які плача ля згалоўя афяры яго так званага «лячэння».

Такі гэты самы Левін! Недалёка ўпо[…] ад Ягоды!

Такі Ягода, якому на лаве падсу[…]ных адведзена сур'ёзнае месца, побе[…] з Бухарыным і Рыкавым. Гэта — адзі[…] з буйнейшых змоўшчыкаў, адзін з ві[…]нейшых ворагаў совецкай улады, адзі[…] з самых наглых здраднікаў, чалаве[…] які прабаваў у самым НКВД арганіз[…]ваць групу і часткова арганізаваў [...]са здраднікаў — Паўкера, Валовіч[…] Гая, Вінецкага і іншых, якія аказалі[…] польскімі і нямецкімі шпіёнамі і развед[…]чыкамі. Такім з'яўляўся і сам Ягод[…] які замест таго, каб нашу слаўную ра[…]ведку накіраваць на карысць совецка[…] народа, на карысць соцыялістычна[…] будаўніцтва, прабаваў павярнуць [...] супроць нашага народа, супроць на[…]шай рэволюцыі, супроць соцыялізма.

Не ўдалося, сарвалася! Ягода бы[…] выкрыт, выкінут з нашага дзяржаўна[…]га апарата, пасаджан на лаву па[…]судных, абяззброен і павінен быць ц[…]пер выкінут, выкрэслен зусім з жыцц[…]

Юрыдычныя пытанні

Я канчаю. У заключэнне я хачу паставіць некалькі пытанняў, якія-б я назваў юрыдычнымі пытаннямі.

Перш за ўсё — пытанні аб саўдзеле. Як паказала судовае следства, не ўсе абвінавачваемыя ў роўнай ступені ўдзельнічалі ў злачынствах, якія прайшлі на гэтым судовым працэсе.

Адсюль пытанне, у якой меры і ў якой ступені кожны з абвінавачваемых можа і павінен адказваць за прад'яўленыя ім абвінавачванні па абвінаваўчаму заключэнню.

Другое пытанне — у якой меры і ступені даказаны прад'яўленыя падсудным абвінавачванні.

І трэцяе пытанне — якога пакарання заслугоўваюць абвінавачваемыя. Я адкажу, перш за ўсё, на другое пытанне. Ці даказаны і ў якой ступені зробленыя абвінавачваемымі злачынствы? Я думаю, што вы, таварышы суддзі, у сваім прыгаворы адкажаце на гэтае пытанне станоўча: так, даказаны. Даказаны прызнаннем саміх падсудных, даказаны сведкамі, прайшоўшымі перад судом, даказаны заключэннем медыцынскай экспертызы, даказаны рэчавымі доказамі.

Уся сукупнасць доказаў, мыслімых у крымінальным працэсе, ёсць тут, зараз у распараджэнні суда. На падставе гэтых доказаў суд зможа вызначыць сваё канчатковае рашэнне аб ступені віноўнасці таго ці іншага злачынцы, зрабіўшага гэтыя злачынствы.

Па-другое, у якой меры кожны з падсудных павінен па нашаму закону адказваць за ўсю сукупнасць зробленых гэтай змоўшчыцкай бандай злачынстваў. Я на гэта пытанне адказваю: у поўным аб'ёме. Чаму?

Кожны падсудны павінен адказваць за ўсю сукупнасць злачынстваў, як член змоўшчыцкай арганізацыі, злачынныя задачы і мэты, злачынныя метады ажыццяўлення якіх былі кожнаму з іх вядомы, кожным адобраны і прыняты. Тут мы наглядаем толькі своеасаблівы «падзел працы» ў злачыннай дзейнасці, у залежнасці ад спецыяльных якасцей і сродкаў, якія знаходзіліся ў распараджэнні кожнага ўдзельніка банды. Гэта зусім натуральна і законамерна з пункту погляду інтарэсаў усёй змовы ў цэлым.

У гэтай справе, таварышы суддзі, у наяўнасці змоўшчыцкая група, агентура замежных разведак, аб'яднаная агульнай для ўсіх яе членаў воляй, адзінай для іх усіх злачыннай мэтай. Канкрэтныя злачынствы, зробленыя тымі або іншымі злачынцамі, гэта—толькі прыватныя выпадкі гэтага адзінага для ўсіх падсудных плана злачыннай дзейнасці.

Гэта агульнасць злачыннай дзейнасці юрыдычна выражана ў прад'яўленым усім падсудным абвінавачванні па арт. 58-11 КК РСФСР.

Гэта, аднак, не азначае, што ўсе павінны адказваць аднолькава. Гэта не выключае абавязку суда індывідуалізаваць пакаранне ў залежнасці ад канкрэтнай ролі кожнага падсуднага ў данай справе.

З гэтага пункту гледжання я лічу, што з агульнага ліку абвінавачваемых належыць выдзеліць двух — гэта Ракоўскага і Бессонава. Я лічу, што Ракоўскі, які хоць і зрабіў найцяжэйшыя злачынствы супроць совец[…] дзяржавы, супроць совецкай улад[…] усім сваім становішчам у гэтай змов[…] сваёй, калі можна так выразіцца, пэ[…]нага роду адарванасцю ад усіх ва[…]нейшых, зробленых «права-трацкісцкі[…] блокам» злачынстваў, заслугоўвае т[…]го, каб да яго была прыменена мен[…] суровая мера пакарання, чым да аста[…]ніх абвінавачваемых.

Тое-ж самае можна сказаць у пэ[…]най меры і аб Бессонаве, які, вядом[…] адрозніваецца ад Чэрнова, Розенголь[…]ца, Крэсцінскага або Рыкава хаця[…]тым, што яго роля абмяжоўвалася рол[…]лю связіста, якая хоць таксама зла[…]чынна, але па ўсёй сваёй істоце па[…]вінна ацэньвацца інакш, чым злачы[…]ствы асноўных абвінавачваемых па г[…]тай справе.

У адносінах гэтых асоб я лічу-бы[…] магчымым прымяненне закона ад [...] кастрычніка 1937 года, дазваляюча[…] суду ў асобых выпадках выбіраць ме[…]ру пакарання сярэднюю паміж 10 га[…]дамі пазбаўлення волі і вышэйшай ме[…]рай соцыяльнай абароны. Я лічу, што[…] ў адносінах Ракоўскага і Бессонав[…] можна абмежавацца 25 гадамі турэм[…]нага зняволення.

Па абвінаваўчаму заключэнню ўсе[…] абвінавачваемыя выкрыты ў тым, што[…] ў 1932—1933 г. яны па заданню разве[…]дак замежных дзяржаў склалі змоў[…]шчыцкую групу пад назвай «права[…]трацкісцкі блок», паставіўшую сваё[…] мэтай учыненне злачынстваў, якія бы[…]лі тут поўнасцю даказаны.

Даказана, што гэты блок складаўся[…] з агентаў разведак некаторых замеж[…]ных дзяржаў. Даказана, што «права[…]трацкісцкі блок» падтрымліваў сістэ[…]матычныя незаконныя адносіны з не[…]каторымі замежнымі дзяржавамі ў мэ[…]тах атрымання ад іх дапамогі для[…] ажыццяўлення сваіх злачынных замыс[…]лаў, для звяржэння совецкай улады [...] для ўстанаўлення ў СССР улады па[…]мешчыкаў і капіталістаў. Даказана[…] што «права-трацкісцкі блок» сістэма[…]тычна займаўся шпіянажам у карысць[…] гэтых дзяржаў, снабжаючы іх разведк[…] важнейшымі дзяржаўнымі сакрэтным[…] матэрыяламі.

Даказана, што «права-трацкісцк[…] блок» сістэматычна ажыццяўляў у гэ[…]тых-жа мэтах шкодніцкія і дыверсій[…]ныя акты ў розных галінах нашай на[…]роднай гаспадаркі — у галіне прамы[…]словасці, сельскай гаспадаркі, фінан[…]саў, комунальнай гаспадаркі, на чы[…]гунках і т. д.

Даказана, што «права-трацкісцкі[…] блок» арганізаваў рад тэрарыстычных[…] актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і со[…]вецкага ўрада, што гэты «права-трац[…]кісцкі блок» ажыццявіў тэрарыстычныя[…] акты супроць С. М. Кірава, В. Р. Мен[…]жынскага, В. В. Куйбышэва, А. М. Гор[…]кага, а таксама ажыццявіў умярцвен[…]не М. А. Пешкова.

Даказана, што блок арганізаваў, ал[…]е не паспеў, на наша шчасце, ажыцця[…]віць рад тэрарыстычных актаў супроць[…] кіраўнікоў нашай партыі і ўрада.

Такія акалічнасці данай справы. Та[…]кая роля ў гэтай справе кожнага [...] падсудных, якія чакаюць зараз, тава[…]рышы суддзі, вашага прыгавору.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Няма слоў, каб абрысаваць жудаснасць зробленых падсуднымі злачынстваў. Ды і ці патрэбны, пытаюся я, яшчэ якія-небудзь для гэтага словы? Не, таварышы суддзі, гэтыя словы не патрэбны. Усе словы ўжо сказаны, усё разабрана да драбнейшых падрабязнасцей. Увесь народ цяпер бачыць, што прадстаўляюць сабой гэтыя страшыдлы.

Народ наш і ўсе чэсныя людзі ўсяго свету чакаюць вашага справядлівага прыгавору. Няхай-жа ваш прыгавор прагрыміць па ўсёй нашай вялікай краіне, як набат, які кліча да новых подзвігаў і да новых перамог! Няхай прагрыміць ваш прыгавор, як асвяжаючая і ўсеачышчаючая навальніца справядлівага совецкага пакарання!

Уся наша краіна, ад малога да старога, чакае і патрабуе аднаго: здраднікаў і шпіёнаў, прадаваўшых ворагу нашу радзіму, расстраляць, як паганых псоў!

Патрабуе наш народ аднаго: раздавіце праклятую гадзіну!

Пройдзе час. Магілы ненавісных здраднікаў зарастуць бур'янам і чартапалохам, пакрытыя вечным прэзрэннем чэсных совецкіх людзей, усяго совецкага народа.

А над намі, над нашай шчаслівай краінай, па-ранейшаму ясна і радасна будзе ззяць сваімі светлымі праменнямі наша сонца. Мы, наш народ, будзем па-ранейшаму шагаць па ачышчанай ад апошняй нечысці і мерзасці мінулага дарозе, на чале з нашым любімым правадыром і настаўнікам — вялікім Сталіным—наперад і наперад да комунізма!

ХРОНІКА

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР адхіліў хадайніцтва аб памілаванні асуджаных Ваеннай Калегіяй Вярхоўнага Суда СССР 13 сакавіка гэтага года па справе антысовецкага «права-трацкісцкага блока» — **Бухарына** Н. І., **Рыкава** А. І., **Ягоды** Г. Г., **Крэсцінскага** Н. Н., **Іванова** В. І., **Чэрнова** М. А., **Грынько** Г. Ф., **Зеленскага** І. А., **Ікрамава** Акмаля, **Хаджаева** Файзулы, **Шаранговіча** В. Ф., **Зубарэва** П. Т., **Буланава** П. П., **Левіна** Л. Г., **Казакова** І. Н., **Максімава-Дзікоўскага** В. А., **Кручкова** П. П.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята—25-394, рэдактара—20-831. Уп. Галоўлітбела № 4247.